Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

**Н.Э.ШАНДРОХА**

# ЭКСПРЭСІЎНЫ СІНТАКСІС

Вучэбна-метадычны дапаможнік
па аднайменным спецкурсе для студэнтаў спецыяльнасці
Г 02.01.04 «Беларуская мова і літаратура»
са спецыялізацыяй «Рыторыка»

Гродна 2002

УДК 801.56.2+82.08.085(075.8)
ББК 81.411.3
Ш 20

Рэцэнзенты: кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры рускай мовы БДУ А.Я.Долбік;

кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускай і рускай моў і методык іх выкладання ў пачатковай школе ГрДУ імя Я.Купалы С.Я.Кострыца

Рэкамендаваны саветам філалагічнага факультэта ГрДУ імя Янкі Купалы

**Шандроха Н.Э.**

Ш20 Экспрэсіўны сінтаксіс: Вучэб.-метад. дапам. / Н.Э.Шандроха. — Гродна: ГрДУ, 2002. — 62 с.

ISBN 985-417-414-X.

Прадстаўлены шматаспектны навукова прадуманы агляд найбольш распаўсюджаных у маўленні экспрэсіўных сінтаксічных фігур: вызначаюцца іх структура, функцыя, сфера ўжывання. Змешчаныя ў дапаможніку разнастайныя мастацкія і прафесійна накіраваныя тэксты, а таксама арыгінальныя да іх заданні прадугледжваюць дарэчнае, свядомае выкарыстанне сродкаў экспрэсіўнага сінтаксісу ў маўленчай практыцы студэнтаў. Матэрыял дапаможніка можа быць выкарыстаны пры чытанні аднайменнага спецкурсу па рыторыцы.

Адрасуецца выкладчыкам і студэнтам-філолагам ВНУ, студэнтам гуманітарных факультэтаў ВНУ, школьным настаўнікам і метадыстам, шырокаму колу чытачоў – тым, каму неабыякавы лёс роднага слова.

**УДК 801.56.2+82.08.085(075.8)**
**ББК 81.411.3**

**ISBN 985-417-414-X.**

© Шандроха Н.Э., 2002

# АД АЎТАРА

*Так хацелася Цыцэрону,*
*Калі ён гаварыў прамовы,*
*Каб шумела густою кронай,*
*Не сціхала ніколі*
*Мова.*
...
*Стаў легендай*
*Твой шлях суровы.*
*Ave, мова!*
*Вечная мова.*

*П.Сушко*

Адна з галоўных функцый мовы — эмацыйная (канататыўная), праз якую чалавек і выяўляе свае пачуцці, эмоцыі. Моўная асоба выяўляецца не толькі ў фармальным выказванні і ўчынку, але і ў экспрэсіўнай рэакцыі на дзеянні іншага суб’екта, з’явы, падзеі з дапамогай адпаведных моўных сродкаў. Да іх адносяцца экспрэсіўныя фігуры як своеасаблівыя адхіленні ад моўнай нормы з мэтай узмацнення экспрэсіўнага эфекту маўлення. Такім чынам, мова з дапамогай фігур становіцца сродкам псіхалагічнага ўздзеяння на слухача ці чытача. У сучасным мовазнаўстве сінтаксічны лад мовы разглядаецца як стрыжнёвая аснова маўлення. Менавіта таму актуальным застаецца вывучэнне ***экспрэсіўнасці*** як эстэтычнай катэгорыі, уласцівай ***сінтаксічнаму ўзроўню***, што, у сваю чаргу, дазволіць павысіць эфектыўнасць выкарыстання тэкстаў у мэтах развіцця культуры, навукі і мастацтва, у сацыяльным рэгуляванні паводзін моўнай асобы.

Дапаможнік «Экспрэсіўны сінтаксіс» напісаны ў адпаведнасці з праграмай па аднайменным спецкурсе і новай праграмай па дысцыпліне «Сучасная беларуская мова» для студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ, падрыхтаванай аўтарскім калектывам кафедры беларускай мовы Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы. Так, у прыватнасці, у раздзеле «Сінтаксіс» выразна акрэслены такія экспрэсіўныя прыёмы, як адваротны (суб’ектыўны) парадак слоў, сінтаксічныя канструкцыі са значэннем «назоўны ўяўлення», эліптычныя сказы, рытарычныя пытанні, перыяд і інш.

Аўтар дапаможніка ставіць мэтай сфарміраваць у студэнтаў веды пра функцыі кожнай з сінтаксічных фігур (якія камунікатыўныя задачы вырашае фігура? у якіх умовах і дзе яе лепш ужываць?); выпрацаваць навыкі не толькі вызначэння і адрознення экспрэсіўных

сінтаксічных фігур у канкрэтных тэкстах, але і дарэчнага, свядомага выкарыстання іх ва ўласным маўленні.

Названы дапаможнік мае пераважна *практычна-маўленчы накірунак* і прызначаецца для чытання аднайменнага спецкурса студэнтам-філолагам з дадатковай спецыялізацыяй «Рыторыка». Будучыя настаўнікі-славеснікі, абапіраючыся на прапанаваны матэрыял дапаможніка, змогуць актывізаваць сваё маўленне, удасканаліць веды па такіх сумежных дысцыплінах, як сінтаксіс, стылістыка і рыторыка, што, безумоўна, задаволіць патрэбы сучаснай школьнай практыкі.

Кампазіцыйную будову дапаможніка складаюць некалькі раздзелаў. У першых двух пададзены тэарэтычны матэрыял пра экспрэсіўнасць у сінтаксічнай арганізацыі маўлення і класіфікацыю экспрэсіўных сінтаксічных фігур. Наступныя пяць раздзелаў носяць тэарэтычна-практычны характар. Кожны з іх прысвечаны кароткаму тэарэтычнаму апісанню пэўнай групы фігур. У дапаможніку, зразумела, немагчыма было дэталёва даследаваць усе экспрэсіўныя прыёмы маўлення, а таму на разгляд прапануецца трыццаць найбольш ужывальных экспрэсіўных фігур — той мінімум, які неабходны, на нашу думку, кожнаму інтэлігентнаму чалавеку, неабыякаваму да моўнай культуры, і асабліва філолагу. Разам з тым праводзіцца думка, што экспрэсіўныя фігуры варта ўжываць у маўленні толькі тады, калі яны арганічна спалучаюцца са зместам выказвання. Інакш кажучы, імі нельга злоўжываць, бо фігуры — як соль: няма яе — нясмачна, а многа — немагчыма есці.

Практычная частка кожнага з пяці раздзелаў прадстаўлена *мініпрактыкумам*, пры складанні якога ўлічаны асобасны падыход і дзейнасны характар прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў роднай мовы. Заданні прадугледжваюць навучаць студэнтаў праяўляць моўную індывідуальнасць, назіраць за сінтаксічнымі з’явамі, дыскусіраваць, адстойваць свае меркаванні. Менавіта таму частка заданняў носіць сітуацыйны характар, дзе прадстаўлены пэўныя маўленчыя сітуацыі, з якімі будучы настаўнік сустрэнецца ў школе, калектыве, паўсядзённым жыцці. Прапанаваныя ў дапаможніку прафесійна накіраваныя тэксты і заданні да іх патрабуюць ад студэнтаў не толькі знаходзіць і размяжоўваць экспрэсіўныя сінтаксічныя фігуры, але і глядзець у глыбіню тэксту, усведамляць ужытую экспрэсію як інструмент уздзеяння на душы людскія. Пераважная частка ілюстрацыйнага матэрыялу — вершаваныя творы, бо яны больш эмацыянальныя і лепш запамінаюцца. Разам з тым на старонках багата прыкладаў з мастацкай прозы, публіцыстыкі, фальклору. У апошні раздзел «Са старажытнай спадчыны» ўключаны вершы пра сінтак-

січныя фігуры з лацінскай паэзіі IV–VI ст.ст. з мініпрактыкумам. У канцы дапаможніка змешчаны спіс літаратуры ў дапамогу філолагу.

Дапаможнік адрасуецца перш-наперш студэнтам-філолагам, а таксама студэнтам гуманітарных факультэтаў ВНУ, навучэнцам педагагічных каледжаў, настаўнікам і вучням старэйшых класаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў. Ёсць спадзяванне на плённае, творчае выкарыстанне прапанаванага матэрыялу і яго садзейнічанне нялёгкай справе памнажэння і развіцця дару роднага слова.

Аўтар шчыра ўдзячны афіцыйным рэцэнзентам дапаможніка і калегам кафедры беларускай мовы Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, якія сваімі каштоўнымі парадамі і слушнымі заўвагамі садзейнічалі яго паляпшэнню.

## ЭКСПРЭСІЎНАСЦЬ І СІНТАКСІЧНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ МАЎЛЕННЯ

Актывізацыя цікавасці да камунікатыўных аспектаў мовы, у прыватнасці, да праблемы ***экспрэсіўнасці,*** тлумачыцца павышанай увагай у апошнія дзесяцігоддзі да праблемы моўнай асобы. Як слушна адзначае лінгвіст В.А.Маслава, «асноўнай функцыяй экспрэсіўнасці якраз і з’яўляецца ўзмацненне ўздзеяння на інтэлектуальную, эмацыянальную і валявую сферы асобы рэцыпіента. Экспрэсіўнасць змяняе эмацыянальны стан носьбіта мовы, уплываючы такім чынам на яго мэтанакіраваную дзейнасць»[1] . У слоўніку лінгвістычных тэрмінаў даецца наступнае тлумачэнне экспрэсіі: «Экспрэсія (лац. *expressio* — выражэнне, выяўленне) — выразна-маляўнічыя якасці мовы, якія надаюць маўленню вобразнасць і эмацыянальнасць»[2] .

Наша маўленне існуе не толькі для таго, каб перадаваць думкі або пабуджаць суразмоўцу да дзеяння ці адказу на пастаўленае пытанне, але і для выражэння пачуццяў. Ш.Балі ў «Французскай стылістыцы» пісаў, што «чалавечая думка пастаянна вагаецца паміж лагічным успрыняццем і эмоцыяй: мы або разумеем, або адчуваем, часцей за ўсё наша думка складаецца адначасова з лагічнай ідэі і пачуцця»[3] . Эмоцыі, воля, ацэнкі, пажаданні — неад’емныя фактары

---

[1] Маслова В.А. Лингвистический анализ экспрессивности художественного текста: Учебное пособие. — Мн.: Вышэйшая школа, 1997. — С.12.

[2] Сцяцко П.У. і інш. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў. — Мн.: Вышэйшая школа, 1990. — С. 173.

[3] Балли Ш. Французская стилистика. — М.: Иностранная литература, 1965. — С. 182.

чалавечага пазнання рэчаіснасці. Нашы думкі афармляюцца ў маўленні. Адзінкай маўлення выступае ***тэкст***, які па-рознаму можа быць стылістычна афарбаваны ў залежнасці ад мэты і задачы выражэння думкі. Такім чынам, экспрэсіўнасць тэксту — гэта выражаны моўнымі і маўленчымі сродкамі эмацыянальны стан гаворачай асобы, яе суб’ектыўныя адносіны да прадметаў і з’яў рэчаіснасці. Або, на думку В.А.Маславай, «экспрэсіўнасць — гэта ўзмацненне, акцэнтаванне зместу тэксту з дапамогай розных моўных сродкаў і прыёмаў»[4].

Экспрэсіўнасць уласціва адзінкам усіх узроўняў мовы. Да фанетычных экспрэсіўных сродкаў адносяцца інтанацыйныя і акцэнтныя сродкі. Марфалагічныя сродкі ўключаюць шырокі дыяпазон ласкальных і зневажальных афіксаў. Лексічныя экспрэсіўныя сродкі ахопліваюць пласт слоў, якія маюць акрамя прадметна-лагічнага значэння ацэначны кампанент. Усе экспрэсіўныя сродкі валодаюць выразна выражанай станоўчай ці адмоўнай канатацыяй. Важнае месца сярод граматычных сродкаў адводзіцца ***сінтаксічным***, якія ўжо даследаваны ў працах Г.М.Акімавай, В.В.Аляксандравай, Э.М.Берагоўскай, Ю.М.Маліновіч, В.А.Маславай, А.П.Скавароднікава і іншых вучоных.

У дачыненні да сінтаксічных канструкцый экспрэсіўнасць можа разумецца па-рознаму. Так, А.С.Папоў вызначае экспрэсію як «асобую моўную з’яву, якая заключаецца ў падкрэсліванні, вылучэнні таго ці іншага адрэзку маўлення на нейтральным фоне»[5]. З боку семантычнага зместу сінтаксічную экспрэсіўнасць разглядаюць як «выражэнне ў сказе эмацыянальных праяўленняў і валявых намаганняў гаворачай асобы»[6]. Л.А.Кісялёва лічыць, што «экспрэсіўная моўная інфармацыя з’яўляецца інфармацыяй пра экспрэсіўныя якасці мовы, пра асобую выразную сілу моўных сродкаў, якая выступае ў выглядзе такіх прыватных катэгорый, як «вобразнасць», «інтэнсіўнасць», «навізна»[7]. На фоне разнастайнасці дэфініцый паняцця сінтаксічнай экспрэсіўнасці яе мэтазгодна вызначаць як «уласцівасць сінтаксічных форм павялічваць прагматычны патэнцыял выказванняў звыш той ступені,

---

[4] Маслова В.А. Лингвистический анализ экспрессивности художественного текста: Учебное пособие. — Мн.: Вышэйшая школа, 1997. — С.13.

[5] Попов А.С. Именительный темы и другие сегментированные конструкции в современном русском языке // Развитие грамматики и лексики современного русского языка. — М.: Наука, 1964. — С. 256.

[6] Панасюк А.Т. К вопросу об экспрессивном значении синтаксических конструкций // Современный русский язык и методика его преподавания. — Душанбе, 1972. Ч.2. — С. 24.

[7] Киселёва Л.А. Теоретические проблемы исследования языка как средства воздействия. Автореф. дис. ... докт. филолог. наук. — М., 1973. — С. 9.

якая дасягнута лексічнымі значэннямі элементаў, што напаўняюць гэтыя сінтаксічныя формы»[8]. Адметнасць дадзенага азначэння праяўляецца ў тым, што яно размяжоўвае лексічную экспрэсіўнасць і сінтаксічную, не звужаецца сутнасць самой з'явы, бо сінтаксічная экспрэсіўнасць падаецца як прагмалінгвістычная катэгорыя, накіраваная на ўзмацненне ўражання ад успрынятай інфармацыі.

Экспрэсіўнасць цесна звязана з эмацыянальнасцю. Эмацыянальнасць адлюстроўвае сэнсавыя адценні слоў і граматычных форм, якія характарызуюцца выражэннем пачуццяў, эмоцый у працэсе стварэння і ўспрымання тэксту. Калі эмацыянальнасць суадносіцца са сферай пачуццяў чалавека, то экспрэсіўнасць — з чалавечым мысленнем. У большасці выпадкаў словы характарызуюцца і эмацыянальнасцю і экспрэсіўнасцю адначасова. Аднак экспрэсіўнае слова не заўсёды эмацыянальнае. Эмацыянальна-экспрэсіўная афарбоўка моўных сродкаў аказвае ўплыў на непасрэднае моўнае асяроддзе, надаючы пэўнае адценне кантэксту, выказванню.

Пры даследаванні экспрэсіўнага сінтаксісу важна ўлічваць тое, што «экспрэсіўная сінтаксічная адзінка — гэта варыянт, мадыфікацыя пэўнай нейтральнай інварыянтнай сінтаксічнай адзінкі»[9]. Так, пры ўспрыняцці экспрэсіўнага тэксту адбываецца суаднясенне кожнага канкрэтнага сказа з агульнапрынятымі сінтаксічнымі нормамі: прамым парадкам слоў, тыповымі спосабамі выражэння членаў сказа і інш. Так, як слушна лічыць лінгвіст В.А.Маслава[10], чым большае адрозненне экспрэсіўнай канструкцыі ад моўнай нормы, тым большая верагоднасць, што гэтая сінтаксічная канструкцыя будзе ўспрынята чытачом ці слухачом менавіта як экспрэсіўная.

Экспрэсіўнымі лічацца ўсе фігуры маўлення, пераважная частка якіх заснавана на законах сіметрыі — сінтаксічны паралелізм, антытэза, хіязм, полісіндэтон і інш. І, наадварот, парушаецца сіметрычная структура ў інверсіі, сегментацыі, парцэляцыі, эліпсісе і інш.

Многія даследчыкі экспрэсіўнага сінтаксісу ўлічваюць фактар працягласці сказаў[11], з чым і звязана тэндэнцыя да празмернасці-эканоміі сказаў. У дадзеным дапаможніку разглядаюцца павелічэнне

---

8 Чайковский Р.Р. Общая лингвостилистическая категория экспрессивности и экспрессивность синтаксиса // Учён. зап. МГПИИЯ им. Тореза. Вопросы романо-германской филологии. — М., 1971. Т. 64. — С. 196.

9 Маслова В.А. Лингвистический анализ экспрессивности художественного текста: Учебное пособие. — Мн.: Вышэйшая школа, 1997. — С.65.

10 Там жа. – С.65.

11 Кухаренко В.А. и др. Отступление в структуре текста // Коммуникативная направленность текста и его перевод. — Киев, 1988. — С. 69.

і памяншэнне аб'ёму выказванняў. Да экспрэсіўных сінтаксічных фігур павелічэння аб'ёму выказвання можна аднесці градацыю, гемінацыю (паўтор), полісіндэтон, перыяд, анафару, эпіфару і інш. Так, напрыклад, дастаткова экспрэсіўным і частым па ўжыванні можа выступаць паўтор слоў ці цэлых канструкцый, якія ўзмацняюць аўтарскую ацэнку, прычым паўторы ў мастацкіх тэкстах могуць сустракацца і не даслоўныя ***(Пяць** першых **дзён і пяць начэй** той вецер ішоў **на Беларусь, на Беларусь** (В.Ярац); **Дзецятка маё роднае, дзецятка маё мілае,** Куды ж ты ад **мяне адлятаеш**? І з кім ты **мяне пакідаеш**? **Бяседанька мая маркотная, Бяседанька мая пячальная**! (з хаўтурных народных галашэнняў)).*

Супрацьлеглая празмернасці тэндэнцыя — эканомія моўных сродкаў або памяншэнне аб'ёму выказвання. Гэта такія экспрэсіўныя фігуры, як эліпсіс, умаўчанне, асіндэтон і інш. — канструкцыі недагаворанасці, якія пры ўспрыняцці тэксту патрабуюць сатворчасці, садумання чытача і аўтара, што, у сваю чаргу, узмацняе экспрэсіўнасць маўлення *(У кантэйнер — горы і лясы, акіяны, моры, небаскробы... (М.Стрыгалёў)).*

Даволі часта ў канкрэтных тэкстах можа назірацца камбінаванае спалучэнне экспрэсіўных сінтаксічных адзінак у адзінае, моцна эмацыянальна ўзвышанае экспрэсіўнае ядро. Так, напрыклад, могуць арганічна спалучацца ў адным тэксце рытарычны вокліч, паўтор, градацыя і інверсія ***(Божа! Божа**! Адзіны ў сусвеце, што **ўсё знае, усё можа, зрабі ж**, каб за нас не пакутвалі дзеці, **не яны каб**, а мы неслі крыж! (Н.Арсеннева))* або анафара, антытэза, полісіндэтон (шматзлучнікавасць і шматпрыназоўнікавасць), сінтаксічны паралелізм і паліптот *(Так **нечакана, нежадана І для** цябе, **і для** мяне, **Мы аддаляемся**, каханы, **Мы разлятаемся**, бы ў сне. **То на** дыханне, **то на** дотык, **То на** маўчанне, **то на** ўздых, **Мы ўсё бліжэй** да адзіноты, **Мы ўсё далей** ад **нас** саміх (В.Русілка)).*

Напрыканцы адзначым, што экспрэсіўныя сінтаксічныя канструкцыі ўжываюцца ў розных стылях, тыпах і жанрах маўлення. Рэдка яны сустракаюцца ў афіцыйна-дзелавых тэкстах, хоць афіцыйна-дзелавы стыль маўлення і разлічаны на ўздзеянне на чытача. Гэта датычыцца і навуковых тэкстаў, якія, разам з тым, часам дапускаюць аўтарскую індывідуальнасць. Даволі экспрэсіўным з'яўляецца размоўны стыль ва ўсіх яго разнавіднасцях (дыялекты, фальклор). Яшчэ ў XVIII ст. французскі рытар Дзюмарсе заўважыў, што за адзін базарны дзень на Цэнтральным рынку Парыжа можна пачуць экспрэсіўных фігур больш, чым за некалькі пасяджэнняў французскай Акадэміі. Экспрэсія размоўна-бытавога стылю тлумачыцца неапрацаванасцю спантаннага маўлення камунікантаў. Вельмі шырока выкарыстоўваецца экспрэсіўны сінтаксіс у мастацкіх і публіцыстычных тэкстах, якія вызначаюцца пастаянным кантактам і ўзае-

мадзеяннем пісьмова-кніжных і гутарковых адзінак. Экспрэсія тут характарызуецца найбольш багатым і разнастайным праяўленнем індывідуальных асаблівасцей моўнай манеры пісьменніка або публіцыста.

## СІНТАКСІЧНЫЯ ФІГУРЫ І ІХ КЛАСІФІКАЦЫЯ

Экспрэсія, як было адзначана вышэй, дазваляе ўявіць змест маўлення даволі наглядна, пераканаўча, а гэта азначае актыўна ўздзейнічаць на слухача і чытача. Адным з прыёмаў арганізацыі экспрэсіўнага маўлення з’яўляюцца фігуры.

Фігура (у перакладзе з лацінскай мовы *figura* — знешні выгляд, вобраз, зварот маўлення) — прыём узмацнення эмацыянальнай выразнасці маўлення, нязвыклы моўны зварот. «Фігуры для маўлення адно і тое ж, што жэсты і міміка для твару: яны надаюць выказванню больш выразнасці, бліскучасці, энергіі або вытанчанасці»[12]. Паколькі найвышэйшым узроўнем арганізацыі маўлення з’яўляецца тэкставы ўзровень, то сярод усёй разнастайнасці фігур (графічныя, фанетычныя, семантычныя) мэтазгодна акцэнтаваць увагу на фігурах ***сінтаксічных*** (або, як інакш іх называюць, стылістычных) — своеасаблівых сінтаксічных канструкцыях празаічнага або вершаванага маўлення, якія не зусім адпавядаюць агульнапрынятым у звычайнай моўнай практыцы сінтаксічным нормам. Сінтаксічныя фігуры маўлення ўтвараюцца шляхам пэўнай стылістычнай пабудовы словазлучэння, сказа ці групы сказаў у тэксце. У названых фігурах галоўная роля належыць сінтаксічнай форме, хоць характар стылістычнага эфекту ў значнай ступені залежыць ад лексічнага (семантычнага) напаўнення.

У практыцы маўлення (публічнага, публіцыстычнага і нават размоўна-бытавога) фігуры міжволі запамінаюцца ў чалавечай свядомасці, што, уласна кажучы, і дае магчымасць вызначыць іх аб’ектам вывучэння. Сінтаксічныя фігуры — гэта формы маўлення. Яны, па-першае, абапіраюцца на псіхалогію ўспрыняцця маўлення, пабуджаюць цікавасць, акцэнтуюць увагу на галоўным; па-другое, «працуюць» заканамернасці мовы — унутрытэкставыя сувязі, канструкцыі простага і складанага сказаў. Выкарыстанне фігур у вусным і пісьмовым маўленні дазваляе ўзбагаціць і разнастаіць тэкст.

Сінтаксічныя фігуры цесна звязаны з экспрэсіўнай будовай маўлення і праяўляюцца ў пэўных формах яе сінтаксічнай арганізацыі.

[12] Луцкий К.Л. Судебное красноречие. — М., Наука, 1992. — С. 209.

Сюды адносяцца **разнастайныя** паўторы (анафара, эпіфара, кальцо, сімплака, шматзлучнікавасць, падваенне і інш.), супастаўленне і супрацьпастаўленне радкоў, групоўка іх у пэўныя інтанацыйна-сінтаксічныя адзінствы (антытэза, паралелізм, перыяд), усе віды і формы парушэння звычайнай сінтаксічнай ці лагічнай сувязі паміж словамі ў межах сказа (інверсія, эліпс, умаўчанне і інш.).

У залежнасці ад сінтаксічнай структуры і экспрэсіўнай функцыі бачыцца мэтазгодным усю разнастайнасць сінтаксічных фігур аб'яднаць у некалькі груп і прадставіць іх класіфікацыю ў выглядзе наступнай схемы* :




У рэальных тэкстах кожная з фігур можа дзейнічаць не ізалявана, а ў спалучэнні з іншымі фігурамі, можа ўключаць у свой склад тропы і іншыя лексіка-семантычныя экспрэсіўныя сродкі. Дзеянне

---

* Названыя сінтаксічныя фігуры згадваюцца ў многіх крыніцах, прысвечаных праблеме экспрэсіўнасці і тэорыі літаратуры, але адзінай, агульнапрынятай класіфікацыі фігур не існуе. Таму, на думку аўтара, дадзеная схема змяшчае найбольш прыдатную сістэматызацыю экспрэсіўных сінтаксічных фігур і іх класіфікацыю па пяці вызначаных групах.

фігур можа быць лакальным (сказ, складанае сінтаксічнае цэлае) і, пры адпаведнай арганізацыі, распаўсюджвацца на ўвесь тэкст. Найчасцей фігуры актывізуюцца ў мастацкім маўленні, асабліва паэтычным, многія з іх можна сустрэць і ў розных жанрах публіцыстыкі. Праілюструем экспрэсіўнае ўжыванне фігур толькі на некаторых прыкладах. Найбольш распаўсюджаны *анафара* — паўтор адных і тых жа слоў, групы слоў, сказаў у пачатку радкоў *(**Добрыя людзі** — свету надзея і лад. **Добрыя людзі** — лепшыя дзеці народа. **Добрыя людзі** — звяртаю да вас свой пагляд (А.Вярцінскі))*; *эпіфара* — паўтор аднолькавых слоў у канцы сказа *(Ёсць у брата бочка гарэлкі — **усё для вас**, А як стане — піва дастане, **усё для вас** (з народнай песні))*; *антытэза* — супрацьпастаўленне кантрастных прадметаў, з'яў *(Ці ведае чалавек урэшце, што яму **лепш**, а што **горш**, што — **страта**, а што — **набытак**, што — **немач**, а што — **здароўе**, што — **мала**, а што — **шмат**? (А.Разанаў))*; *гемінацыя* — кантактны паўтор слоў ці словазлучэнняў у пэўнай паслядоўнасці *(Перасяленцы — мёртвыя, жывыя — **вяртаюцца, вяртаюцца** дамоў... (С.Законнікаў))*; *полісіндэтон* — празмернае ўжыванне ў маўленні злучнікаў ці прыназоўнікаў (*Сумуе вёска **па** жыхарах, **па** іх гаворцы, **па** галасах, **па** звонкаму дзіцячаму смеху, **па** блакітна-чыстаму снегу, **па** кукарэканню, **па** рыканню, **па** жывому маўчанню натомленых палешукоў (А.Грачанікаў))*; *рытарычныя звароты (**О, дзеці, дзеці!** Дзе мне вочы дзець, каб вам, у вашы вочы не глядзець?.. (Н.Гілевіч))* і інш.

Сінтаксічныя фігуры часта «актыўна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, узмацняюць эстэтычную выразнасць і эмацыянальнасць выказвання, пазбаўляюць мастацкую мову аднастайнасці, надаюць ёй стылістычную разнастайнасць і тым самым дапамагаюць лепш выявіць вобразную думку пісьменніка, перадаць яго душэўнае хваляванне»[13] . Функцыя экспрэсіўных сінтаксічных фігур — выдзеліць, падкрэсліць, узмацніць выказванне. Разам з тым гэтыя фігуры патрабуюць асцярожнага іх выкарыстання. Калі яны ўжываюцца без уліку асаблівасцей тэмы і зместу маўлення, то «ствараюць уражанне празмернай рытарычнасці, манернасці і стылізаванасці мовы»[14]. Менавіта таму асноўныя памылкі ў выкарыстанні фігур звязаны: 1) з іх празмернасцю, якая вядзе да падаўлення асобы адрасата; 2) з недарэчнасцю іх выкарыстання ў аўдыторыі, не падрыхтаванай да ўспрыняцця фігур.

[13] Рагойша В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах: Дапам. — Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 2001. — С.302.

[14] Цікоцкі М.Я. Стылістыка беларускай мовы: Вучэб. дапам. для фак. журналістыкі. — Мн.: Універсітэцкае, 1995. — С. 216.

## І. ФІГУРЫ ПАВЕЛІЧЭННЯ АБ’ЁМУ ВЫКАЗВАННЯ

Да названай групы адносяцца экспрэсіўныя сінтаксічныя фігуры, пабудаваныя ў той ці іншай ступені на аснове паўтору разнастайных сінтаксічных адзінак маўлення, размешчаных як адвольна, так і сіметрычна. Рытарычны прыём павелічэння аб’ёму выказвання заключаецца ў тым, што пры ўжыванні экспрэсіі сэнс выказвання выражаны ў больш шырокай, «разгорнутай» форме (паўторы, паралельныя сінтаксічныя канструкцыі і інш.) ў параўнанні са звычайным спосабам выражэння. Сфера дзеянняў сінтаксічных паўтораў не абмяжоўваецца сказам, а распаўсюджваецца на ўвесь тэкст як маўленчы твор. Фігуры павелічэння аб’ёму выказвання перадаюць стабільнасць як станоўчага, так і адмоўнага эмацыянальнага настрою маўлення. Менавіта па гэтай прычыне названыя фігуры шырока прадстаўлены і ў панегірыках (красамоўных прамовах хвалебнага зместу), і ў філіпіках (гнеўных, выкрывальных прамовах). Дэманстрацыя моцнага, узвышанага, працяглага па часе эмацыянальнага пачуцця – вось іх асноўная функцыя.

Да экспрэсіўных сінтаксічных фігур павелічэння аб’ёму выказвання адносяцца: 1) анафара; 2) эпіфара; 3) стык; 4) кальцо; 5) сінтаксічны паралелізм; 6) сімплака; 7) хіязм; 8) антытэза; 9) гемінацыя (паўтор); 10) градацыя; 11) полісіндэтон (шматзлучнікавасць); 12) паліптот; 13) перыяд.

Характарыстыку фігур мэтазгодна пачаць з паўтораў, якія маюць сіметрычнае размяшчэнне кампанентаў.

**1. Анафара** (ад грэч. *anaphora* — узнятасць, паўтарэнне), або **адзінапачатак** — сінтаксічная фігура, якая заключаецца ў паўтарэнні аднолькавых слоў, словазлучэнняў ці сказаў у пачатку вершаваных радкоў або празаічных сказаў. Ствараецца своеасаблівы паралелізм сказаў і эмацыянальна падкрэсліваецца слова, якое паўтараецца. Паўтарацца ў пачатку сказаў могуць такія сінтаксічныя канструкцыі, як спалучэнні слоў і нават цэлыя сказы, што і прыводзіць да ўзнікнення так званай сінтаксічнай анафары. Заўважым, што сінтаксічная анафара сустракаецца і ў празаічных, і ў вершаваных творах: *Вялікай прагнасцю дыхала глеба.* ***Яна любіла****, калі над ёю рыпалі-хрусцелі косці, калі мускулы рабіліся цвёрдымі, як дубовыя сукі, і пругкімі, як сталёвыя спружыны.* ***Яна любіла****, калі гарачая жыжа поту бруднымі ручаінкамі разыходзілася па глыбокіх зморшчынах загарэлага твару.* ***Яна любіла****, калі шышкі-мазалі глебнага колеру цёрліся-шараваліся, як брускі, і фарбаваліся крывёй (З.Бядуля).*

Або:

***Трэба дома бываць*** *часцей,*
***Трэба дома бываць*** *не госцем,*
*Каб душою не ачарсцвець,*
*Каб не страціць святое штосьці. (Р.Барадулін)*

Функцыя анафары як экспрэсіўнай сінтаксічнай фігуры — прадэманстраваць упэўнены эмацыянальны настрой. Асабліва ўдала ўжываецца анафара ў перадачы аптымістычнага настрою. Гэта любімая, найбольш ужывальная фігура палітычных дзеячоў, прамоўцаў, якія пачынаюць новы сказ ці абзац з аднолькавых слоў. Анафару можна сустрэць і ў рэкламных тэкстах. Тут, пры яе ўдалым ужыванні, анафара не паспявае стаць надакучлівай, а, наадварот, стварае ўражанне шчырай парады. Напрыклад: ***Падарыце сабе*** *непаўторную элегантнасць французскай моды,* ***падарыце сабе*** *часцінку французскага шарму! (з тэлевізійнай рэкламы)*

**2. Эпіфара** (ад грэч. *epiphora* — паўтарэнне, перанос, дабаўленне) — сінтаксічная фігура, супрацьлеглая анафары, дзе суседнія сказы заканчваюццца аднолькавымі спалучэннямі слоў ці выразаў, што таксама ўзмацняе, падкрэслівае іх: *Яго скаланула гэтае* ***дадому****. Да якога* ***дому****? Да чыйго? Няма ў дзяцей* ***дому****! (І.Шамякін)* . Або прыклад эпіфары з купальскай народнай песні:

*Дзевачкі, з ружы вянкоў не віце,*
***Купала****,*
*Дзевачкі, рана замуж не йдзіце,*
***Купала****.*
*Віце вяночкі ды із чабору,*
***Купала****.*
*Ідзіце замуж ды ўпору,*
***Купала****.*

Эпіфару могуць прадстаўляць і сінтаксічныя канструкцыі ў выглядзе цэлых сказаў. Вось як, напрыклад, экспрэсіўна гучаць эпіфарычныя сказы-праклёны:

*Хто адрокся сваіх,*
*Хто стыдацца нас стаў*
*І прыліп да чужых, —*
***Каб ён свету не знаў!***

*Мову родную хто*
*Пазабыў, асмяяў.*
*Загубіў за нішто, —*
***Каб ён свету не знаў!*** *(Г.Леўчык)*

Заўважым, што эпіфара, у адрозненне ад анафары, таксама надае маўленню ўпэўненасць, але разам з тым яна адлюстроўвае нейкую пэўную непазбежнасць падзей, і таму радзей дэманструецца ўзнёсласць, акрыленасць фразы. Так, у мажорных прамовах эпіфару лепш не выкарыстоўваць. Шырока выкарыстоўвалі эпіфарычную экспрэсію ў сваіх славутых прамовах антычныя мудрацы слова, у прыватнасці Марк Тулій Цыцэрон (106 – 43 гг. да н.э.), вядомы рымскі палітычны дзеяч, прамоўца, публіцыстычны пісьменнік: *«Вы смуткуеце аб тым, што тры войскі рымскага народа знішчаны, — загубіў іх* ***Антоній****. Вы не далічваецеся праслаўленых грамадзян — і іх забраў у нас* ***Антоній****. Аўтарытэт нашага саслоўя звергнуты — зверг яго* ***Антоній****. Словам, калі разважаць строга, то ўсё тое, што мы пазней пабачылі (а якіх толькі бедстваў і няшчасцяў не бачылі мы?), мы аднясём на рахунак сумлення аднаго толькі* ***Антонія****» (Цыцэрон. Другая філіпіка супраць Марка Антонія).*

**3. Стык**, або **эпанастрафа** (ад грэч. *epanastrophe* — зварот назад) — сінтаксічная фігура, у якой наступны сказ пачынаецца з таго ж слова, словазлучэння ці сказа, якімі заканчваецца папярэдні сказ:

*Раптам прыходзіць* ***думка,***
***Думка*** *шукае* ***слова****.*
***Слова*** *спяшаецца — знае:*
*Трэба яму несці* ***думку****. (М.Дукса)*

Названая экспрэсія выкарыстоўваецца не толькі ў паэзіі, але і ў мастацкай прозе, і ў публіцыстыцы. Так, у празаічным маўленні стык становіцца спосабам далейшага развіцця падзей, думак, надае маўленню своеасаблівую рытмічную арганізацыю і цэласнасць: *Сілу песні чалавек адчувае даўно. Прыйшла яна на свет* ***разам з ім. Разам з ім*** *расла, мацнела, развівалася (Р.Шырма); І назаўтра яе алені* ***не прыйшлі. Не прыйшлі*** *яны і праз дзень (І.Пташнікаў); Яна праўда няспрытна пачала жаць, бо* ***задумалася. Задумалася*** *яна аб дзіцяці сваім... (З.Бядуля); ... пяючы маркотную старасвецкую песню, сядзела дзяўчына ля кросен* ***і ткала. І ткала*** *белымі рукамі сваімі белы кужаль... (З.Бядуля).*

Кампазіцыйны стык даволі часта сустракаецца ў прыказках, прымаўках, казках, а таксама ў народнай песеннай лірыцы:

*Маладая Гэлечка* ***ў сені ўступіла,***
***У сені ўступіла*** *— сені асвяціла.*

Або:

*— Да мамачка, родная, што я за сон відзела!*
*Галубы наляцелі,* ***па застоллю паселі,***
***Па застоллю паселі, чорны шоўк развярцелі,***
***Чорны шоўк развярцелі,*** *золата рассыпалі.*

Гэтая экспрэсіўная фігура па-рознаму называецца даследчыкамі: кампазіцыйны стык, эпанастрафа, анадыплосіс, падхват.

**4. Кальцо** — пэўны сінтаксічны адрэзак маўлення, які пачынаецца і заканчваецца аднолькавымі словазлучэннямі і нават сказамі. Названая экспрэсіўная фігура надае выказванню ўпэўненасць, непазбежнасць у зыходным сцвярджэнні, непахіснасць пажаданай думкі:

***Нічога не хочу... Нічога, нічога*** *—*
*Ні грошай, ні славы, ні шчасця сляпога...*
*А толькі ўсё жду я, каб родная мова*
*Хутчэй дачакала свабоднага слова!*
*Пакуль не даждуся багацця такога, —*
***Нічога не хочу... Нічога, нічога!*** *(Г.Леўчык)*

Класічным узорам ужывання кальца служаць славутыя трыялеты М.Багдановіча (паўтор тройчы), у прыватнасці, трыялет, прысвечаны С.Палуяну:

*Ты быў, як месяц, адзінокі:*
*Самотна жыў, самотна ўмёр.*
*Хоць свет і людны, і шырокі, —*
***Ты быў, як месяц, адзінокі.***
*Красу, і светласць, і прастор*
*Шукаў — і, ад усіх далёкі.*
*Ты быў, як месяц, адзінокі:*
***Самотна жыў, самотна ўмёр.*** *(М.Багдановіч)*

**5. Сінтаксічны паралелізм** (ад грэч. *parallelos* — той, што ідзе побач; паралельны) — экспрэсіўная сінтаксічная фігура, у якой кожная наступная сінтаксічная адзінка будуецца па тыпу папярэдняй — мае аднолькавы склад членаў сказа, аднолькавы парадак слоў, што стварае ўнутраную сіметрыю. Інакш кажучы, паўтор аднатыпных сінтаксічных адзінак у аднатыпных сінтаксічных пазіцыях утва-

рае паралелізм сказаў. У гэтым выпадку члены сказа расстаўлены ў адной паслядоўнасці і выражаны аднолькавымі формамі:

> ***То*** *— быццам бы* ***бура, то*** *— лёгенькі* ***ўздох,***
> *а сэрцы людскія і говіць і раніць,*
> ***разжаліцца просьбаю — слухае Бог,***
> ***раззвоніцца праўдай — баяцца тыраны.*** *(Л.Геніюш)*

У творах мастацкай літаратуры сінтаксічны паралелізм выкарыстоўваецца з мэтай стварэння асаблівай экспрэсіўнай атмасферы кантэксту, часцей узвышанай, лірычнай: ***Як не можа быць дзіцячага пісьменніка, які*** *не разумее і не любіць дзяцей,* ***так не можа быць настаўніка, які*** *выбраў спецыяльнасць не па закліку душы (В.Вітка).* Сінтаксічны паралелізм ужываецца і ў народна-паэтычным маўленні, напрыклад, у прыказках: *Якая справа, такая і слава; Хто шукае, той знаходзіць; Не піў — не мог, а выпіў — ні рук, ні ног; Рукі пабрудзіш — вадою адмыеш, душу забрудзіш — і мыла не паможа; Якое дрэва, такі і клін, які бацька, такі і сын.*

Поўны паралелізм сустракаецца ў пабудове не толькі сказаў, але і цэлых абзацаў:

*Зайшоў гэты фурман у лазню. Глядзіць: тры дзеўкі прадуць. Пастаяў ён пад дзвярмі, чуець,* ***адна кажаць:***

***— Го, каб я за цара пайшла, нічога б не хацела, увесь бы свет абаткала.***

***А другая кажаць:***

***— А каб я пайшла за цара, так бы аднэй бы нітачкай увесь свет адзела.***

***А трэцяя кажаць:***

***— А я каб пайшла за цара, за пана круля, дык бы двух сынкоў прывяла: аднаго з-пад мясёнца, вакол гвяздачкі, а другога з-пад слонца, слонца б свяціла. На адным слонца, на другім месяц і звёзды свяцілі.***

*(З народнай казкі «Два ў кораб арэшкі»)*

У празаічных і вершаваных творах сустракаюцца іншыя разнавіднасці сінтаксічнага паралелізму (сімплака, хіязм, антытэза, гемінацыя і інш.), пра што гаворка пойдзе далей.

**6. Сімплака** (ад грэч. *symphloke* — спляценне) — экспрэсіўная фігура, якая вызначаецца адначасовым ўжываннем у маўленні анафар і эпіфар або паўтораў якіх-небудзь слоў ці словазлучэнняў у сярэдзіне сказаў.

Так, своеасаблівую адметнасць гучання набывае адначасовае ўжыванне анафары і эпіфары ў наступных радках народнай песні гукання вясны:

*Дабравешчанніко святое,*
*Пашлі сонейка залатое,*
***Каб** распусціліся **кветачкі**,*
***Каб** раскраснеліся **кветачкі**...*

Сустракаецца яшчэ разнавіднасць сімплакі, дзе заўважаем паўтор пэўнага слова ў сярэдзіне кожнага сказа:

*Да ў месяца **два** ражкі крутыя,*
*Да ў Янечкі **два** браты радныя,*
*Адзін **брахна** каня сядлаець,*
*А другі **брахна** яго наўчаець:*
*— Да будзь, **брахна**, разумненькі.*
*Да паедзеш, **брахна**, ў чужыя людзі,*
*Выйдзець к табе танок дзевак...*
*(з вясельнай народнай песні)*

**7. Хіязм** — адзін з найбольш складаных відаў сінтаксічнага паралелізму, фігура, у якой паўтараюцца два элементы, прычым пры паўторы яны размяшчаюцца ў адваротным парадку: *Мы пакутуем не столькі ад **сардэчнай недастатковасці**, колькі ад **недастатковай сардэчнасці** (Ю.Шанін); **Ты** спрадвечны **Радзімай**, і **Радзіма** — **табой** (Р.Барадулін); Гуляе **жыццё** з імі **ў смерць, смерць – у жыццё** (А.Разанаў).*

Этымалагічна тэрмін «хіязм» паходзіць ад грэчаскай літары $\chi$ («хі»), форма якой нагадвае від крыжа. Хіязм як лінгвістычная з'ява вядомы яшчэ з антычнасці. Так, прыклад хіязма *«Есці, каб жыць, а не жыць, каб есці»* ўжываецца ўжо ў ананімнай «Рыторыцы для Герэнія», якая датуецца I стагоддзем да н.э.

Хіязм, як і эпіфара, надае маўленню пэўную непазбежнасць. Нагляднасць гэтай непазбежнасці праяўляецца ў тым, што, хоць словы і перастаўляюцца, але сэнс, значэнне застаюцца нязменнымі: *Няма **нізкіх ісцін** і **высокіх падманаў**, ёсць толькі **нізкія падманы** і **высокія ісціны** (М.Цвятаева), Умейце любіць **мастацтва ў сабе**, а не **сябе ў мастацтве** (К.Станіслаўскі).*

Або:

*Адзінай мэты не зракуся.*
*І сэрца мне не задрыжыць:*
*як **жыць** — дык жыць для **Беларусі**,*
*А **без яе** — зусім **не жыць**. (Л.Геніюш)*

Заўважым, што ў вышэй прыведзеных прыкладах хіязм узмацняецца антытэзай. У публіцыстыцы можна сустрэць выпадкі, калі хіязм уяўляе крыжападобнае размяшчэнне элементаў анафары: ***У каго** самая гіганцкая армія ў свеце? **Велізарны** непасільны ваенны бюджэт? **Велізарная** мілітарызаваная навука і прамысловасць? **У каго** найбольш генералаў на адзінку насельніцтва? (З газет).* Хіязм ужываецца не як статычная, а як дынамічная фігура, якой падчас характэрны і гульнявыя ўстаноўкі. Так, у дзіцячым фальклоры знаходзім хіязм у скорагаворках: *Дровы на траве, трава на двары; У мухі няма вуха, няма вуха ў мухі.* Хіязм сустракаецца і ў навуковым стылі: *Можна сказаць, што **няма паэзіі без фігур**... Але зусім відавочна, што **ёсць фігуры без паэзіі** (Ж.Дзюбуа); Пушкін быў **чалавекам у паэзіі і паэтам у жыцці** (Ю.Лотман).*

**8. Антытэза** (ад грэч. *antithesis* — супрацьпастаўленне) — сінтаксічная фігура кантрасту, супастаўленне процілеглых паняццяў, перажыванняў, думак з мэтай узмацнення ўражання ад гэтых з'яў, падкрэслівання кантрасту. Дыяпазон ужывання названай фігуры даволі шырокі і разнастайны: у народнай творчасці: *Адзін **сыцее**, а дзесяць **пацее**; **Багатым жыццё**, а **бедным выццё**; Ты да чалавека з **душой**, а ён да цябе **спіной** (прыказкі); Старана мая, ты старонaчка, старана мая незабытая, не магу цябе прызабыціся, **ні ўночы сплючы, ні ўдзень ходзячы** (народная песня)*; публіцыстыцы і мастацкай літаратуры: *Чалавечае жыццё ўсё роўна, як адзін паварот каляса: спіца **ўзнімаецца ўгару** і зноў **апускаецца ўніз**. І квіта, дзядзька Мікіта. **Было — і няма**... (З.Бядуля).*

Антытэза рэалізуецца ў выглядзе выразу, які складаецца з некалькіх слоў, звязаных паміж сабой адносінамі лексічнай або кантэкстуальнай сінтаксічнай антаніміі. Так, напрыклад, выпадак ужывання менавіта сінтаксічнай антытэзы дэманструецца ў вершы М.Танка:

*Не забывайцеся ж*
*Пра век, у які мы жывём:*
*Век супярэчнасцей грозных*
*Паміж **пуцяводнымі зорамі***
*І **зорамі згаслымі**,*
*Паміж **кавалкам хлеба***
*І **кавалкам цэглы астрожнай**,*
*Паміж глытком **жывой** вады —*
*І **атрутнай**,*
*Паміж **зялёным полымем лісця** —*

*І **полымем крэматорыя,***
*Паміж **струнамі скрыпак, цымбал** —*
*І **струнамі дроту калючага,***
*Паміж **посвістам крыл галубіных Пікаса***
*І **куль**... (М.Танк)*

Часам у маўленні сустракаецца не зусім апраўданае ўжыванне антытэзы, і яе неабходнасць вытлумачваецца толькі зместам, семантыкай выказвання: *Зямлю бацькоў я так **люблю,** што **ненавідзець** маю права! (Р.Барадулін).* Тут, у прыватнасці, увага акцэнтуецца на нечаканым, запамінальным спалучэнні: *ненавідзець маю права!* Але разам з тым, менавіта экспрэсіўная антытэза дакладна і праўдзіва перадае сэнс любові: не славу яе люблю, яе самую, яе прыгожую прыроду, працавітых людзей, і менавіта любоў вымушае не раўнадушна, а з болем-нянавісцю адносіцца да тых, хто разбурае, губіць прыгажосць.

Антытэзе ўласціва валоданне добрымі выразнымі якасцямі, што выяўляецца падчас нават у загалоўках кніг і назвах мастацкіх твораў («Далёкія і блізкія» Я.Чыквіна, «Агонь і снег» І.Шамякіна, «Ружа і штык» В.Віткі, «Тры дні і тры ночы» М.Матукоўскага, «Свае і чужынцы» І.Чыгрынава, «І радасць і боль» С.Грахоўскага і інш.).

**9. Гемінацыя** (або **паўтор, падваенне)** — экспрэсіўная сінтаксічная фігура, заснаваная на кантактным паўторы слоў ці словазлучэнняў у пэўнай паслядоўнасці. Гемінацыя надае маўленню асаблівую экспрэсію, узвышае тон, запавольвае тэмп выказвання, робіць яго велічна-спакойным: *О, **ляціце**, жураўы, **ляціце** сваёй млечнай дарогай, вясёлай і шумнай, бы крыгаход (М.Стральцоў).* Паўтор назіраецца ў сказе двойчы або нават тройчы. Параўнаем:

***Адцвілі, адцвілі**, празвінелі,*
*як начлежныя згаслі агні,*
*недапрадзенай ніткай кудзелі*
*залатыя над Нёманам дні. (Л.Геніюш)*

Або:

***Слізкія, слізкія, слізкія** словы, —*
*Што б ні казала — сабе папярок. (Я.Янішчыц)*

Гемінацыя ў сказе можа займаць прэпазіцыйнае, інтэрпазіцыйнае і постпазіцыйнае становішча:

*Плакала старая Арцёміха сухімі слязьмі і быццам пяяла:*
*— **Зямля-зямелька** родненькая!*
*— А ты ж ужо навекі прыкрыла сцюдзёнымі грудкамі Ганульку маю...*

*— А ты яе **навекі, навекі** схавала ад сонейка!..*
*— Ніколі яна ўжо не адчыніць вочкі ясныя — **ніколі, ніколі!**...*
*— Ніколі галасочак яе не зазвініць — **ніколі, ніколі!**... (З.Бядуля)*

У сказах могуць сустракацца паўторы з адмаўленнем (***Хочаш не хочаш**, а назад дарогі няма. У нас толькі адзін шлях — наперад (з газет)*) або, наадварот, са сцвярджэннем: ***Што было, тое было**, і не дай Бог, каб усё яно паўтарылася (з газет).*

**10. Градацыя** (ад лац. *gradatio* — паступовае павышэнне, узмацненне) — экспрэсіўная сінтаксічная фігура, якая заключаецца ў такім размяшчэнні частак выказвання (слоў, адрэзкаў сказа), дзе адбываецца паступовае нарастанне або, наадварот, аслабленне ўражання, пачуцця, перажывання, у выніку чаго нарастае або паслабляецца эмацыянальна-экспрэсіўнае значэнне выказвання.

Прыкладам нарастання градацыі, калі адбываецца паступовы пераход з'явы ад яе ніжэйшай ступені да вышэйшай, могуць служыць словы з прамовы старажытнагрэчаскага аратара і палітычнага дзеяча Дэмасфена (384 – 322гг. да н.э.): *Я не толькі **заявіў**, але і **напісаў** сваю прапанову, не толькі напісаў, але і **адправіўся паслом**, не толькі адправіўся паслом, але і **пераканаў** фіванцаў, не, — я смела **прайшоў праз усе іспыты** ад пачатку да канца і **аддаваў сябе за вас рашуча** ва ўсіх паграджаючых дзяржаве небяспеках (Дэмасфен. За Ктэсіфонта аб вянку).* Нарастаючую градацыю знаходзім і ва ўрыўку з верша Я.Співакова:

*Як радасна, мой дружа,*
*разумець,*
*Што мой народ **не паграджаў***
*нікому,*
***Не нападаў, не гнаў** нікога з дому*
*І ў дом чужы **не нёс** ніколі*
***смерці**... (Я.Співакоў)*

Другі від градацыі — аслабленне выразнасці маўлення, да якога, у прыватнасці, звяртаецца З.Бядуля ў апавяданні «Велікодныя яйкі»: *Хлапцу перарвалі такі прыемны сон і аднялі ў яго пушачку. Слоў не стае. Найвялікшыя раны ў чалавечай душы **загойваюцца, зарастаюць і забываюцца**, але гэтай болі Сцяпанка, мабыць, да смерці сваёй не забудзе... (З.Бядуля).*

**11. Полісіндэтон**, або **шматзлучнікавасць** (ад грэч. *poli* — шмат і *syndeton* — звязанае) — сінтаксічная фігура, у якой злучнікі або прыназоўнікі паўтараюцца перад кожным аднародным членам

сказа або перад іншымі аднароднымі сінтаксічнымі канструкцыямі: *Тут* ***і*** *ўражанні,* ***і*** *свядомасць,* ***і*** *гонар... З гэтага ж і складаецца чалавек (В.Мартыненка).*

Або:

*Бо тут усё сваёй хадою:*
***І*** *першы ліст,* ***і*** *першы гром,*
***І*** *певень з поўняй маладою,*
***І*** *камарыха з камаром. (Я.Янішчыц)*

Названая сінтаксічная фігура замаруджвае, запавольвае тэмп маўлення, робіць яго разважлівым, але разам з тым паступова ўзмацняецца сэнсавае і эмацыянальнае напружанне маўлення: ***Ні*** *лютасць фашыстаў,* ***ні*** *боль адзіноты,* ***ні*** *пекла забойстваў,* ***ні*** *жах катаванняў — нішто* ***ні*** *на міг не застрашыла горад (К.Кірэенка);* ***А*** *страла?* ***А*** *дрэўка кап'я?* ***А*** *тапарышча? І для гэтых рэчаў не было лепшага матэрыялу, як дуб (Я.Пархута).*

Паўтор як злучнікаў, так і прыназоўнікаў дапамагае надаць выказванням узнёсласць і велічнасць:

***Ад*** *роднае зямлі,* ***ад*** *гоману бароў,*
***Ад*** *казак вечароў,*
***Ад*** *песень дудароў,*
***Ад*** *светлых воблікаў закінутых дзяцей,*
***Ад*** *шолаху начэй,*
***Ад*** *тысячы ніцей,*
*З якіх аснована і выткана жыццё*
*І злучана быццё і небыццё, —*
*Збіраўся скарб, струменіўся няспынна,*
*Вясёлкавым ірдзеннем мне спяваў... (Я.Колас)*

Шматзлучнікавасць і шматпрыназоўнікавасць могуць ужывацца адначасова, што надае маўленню (асабліва фальклорным творам) асаблівую рытмічную, экспрэсіўную выразнасць:

*— Гэта нядзелька ўся ў рабоце была:*
***У*** *панядзелак на рэчачцы стаяла,*
***А ў*** *аўторак сваё бяллё катала,*
***А ў*** *сераду радзіначку збірала,*
***А ў*** *чацвер у хаце прыбірала,*
***А ў*** *пятніцу з баярачкамі гуляла,*
***А ў*** *суботу ў банечку хадзіла,*
***А ў*** *нядзелю на шлюбе стаяла.*
*(з вясельнай народнай песні)*

Або:

*Пытаеш ты мяне,*
***Ці** я твой сын праўдзівы,*
***Ці** толькі верны табе ў слове?*
*Мне цяжка жыць **без** тваіх ніваў,*
*Мне цяжка жыць **без** тваёй мовы,*
***Без** залацістае пшаніцы,*
***Без** мёдадайнай канюшыны,*
***Без** громабойнай навальніцы,*
***Без** белавежскае дзяўчыны,*
*Дык значыць, слова — другараднасць,*
*Сутнасць — **у** шчырай песні сэрца,*
***У** ёй журба,*
***У** ёй і радасць.*
*Як згінеш ты — яна парвецца. (А.Барскі)*

**12. Паліптот** — сінтаксічная фігура, у адпаведнасці з якой слова ўжываецца ў мікракантэксце ў розных граматычных формах: *Для дзіцяці першая кніжка павінна быць загадка, поўная таямніц, якая раскрываецца не адразу, а паступова, **дзень** за **днём** — штораз цікавей і цікавей (В.Вітка).* Або:

*— Нябось, бяроза,*
*Нябось, белая,*
*Я к **табе** вясной буду,*
*З **табой** шумець буду,*
***Цябе** зеляніць буду. (Р.Барадулін)*

Часта выкарыстоўваецца паліптот у народнай творчасці, у дзіцячых скорагаворках, пацешках, вершах: ***Сарока сароку** бачыць здалёку; Вучы **народ**, вучыся ў **народа**; **Дружба дружбай**, а **служба службай** (прыказкі).*

***Елка** ў ельніку жыла,*
***Ёлка** ў ельніку расла.*
***Ёлку** везлі нам на свята:*
*Мы чакалі ля акна,*
*А прывезлі **ёлку** ў хату —*
*Стала **ёлачкай** яна. (С.Сокалаў-Воюш)*

*Пайшоў **Сёма** лавіць **сома**,*
***Соня** спіць спакойна дома.*
***Сёме** — **сом**, **Соні** — сон. (М.Мінчанка)*

**13. Перыяд** (ад грэч. *periodos* — кругазварот, абход) — разгорнутая сінтаксічная пабудова (сказ), якая ў сэнсава-інтанацыйных адносінах пры дапамозе паўзы дзеліцца на дзве часткі, першая з якіх складаецца з шэрагу аднародных адзінак і вымаўляецца з павышэннем голасу, а другая — з паніжэннем голасу і з'яўляецца заключэннем, абагульненнем, вынікам. Гэта невялікі звязны тэкст у выглядзе аднаго сказа, які характарызуецца абавязкова адзінствам тэмы, закончанасцю інтанацыі. Для перыяду характэрна ўрачыстасць, узвышанасць, эмацыянальная афарбоўка:

*... Хай снег гадоў асядзе ў валасах,*
*Хай будзе мне хоць*
*Пяць разоў па дваццаць —*
*Усмешкай палахлівай на губах*
*Ты школьніцай мне будзеш усміхацца. (Р.Барадулін)*

У сінтаксічных адносінах перыяд можа быць простым сказам, у якім паўтараюцца аднатыпныя групы аднародных членаў, але найчасцей перыяд уяўляе складаны сказ — складаназлучаны, у якім простыя сказы ўтвараюць адну і тую ж прэдыкатыўную (звычайна дзеяслоўную) канструкцыю; складаны сказ з рознымі відамі сувязі або складаназалежны сказ, у якім галоўнай частцы падпарадкуюцца паралельна некалькі даданых аднаго віду: параўнальных, уступальных, выніку, часу і інш. Так, у вышэй згаданым вершы Р.Барадуліна перыяд прадстаўлены складаназалежным сказам з даданымі акалічнаснымі ўступальнымі часткамі. Першая частка перыяду *(пратазіс)* звычайна залежыць ад другой *(анадозіс)*, падпарадкоўваецца ёй, з'яўляецца большай па аб'ёму. Часткі перыяду складаюцца з развітых членаў сказа ці простых сказаў, якія называюцца членамі перыяду, і часта звязваюцца аднымі і тымі ж злучнікамі (гл.: полісіндэтон, або шматзлучнікавасць):

*З легендаў і казак былых пакаленняў,*
*З калосся цяжкога жытоў і пшаніц,*
*З сузор'яў і сонечных цёплых праменняў,*
*З грымучага ззяння бурлівых крыніц,*
*З птушынага шчэбету, шуму дубровы,*
*І з гора, і з радасці, і з усяго*
*Таго, што лягло назаўсёды ў аснову*
*Святыні народа, бяссмерця яго, —*
*Ты выткана, дзіўная родная мова. (М.Танк)*

Паміж павышэннем і паніжэннем у перыядзе ставіцца працяжнік і коска (калі яна павінна быць у адпаведнасці з будовай сказа). Астатнія знакі прыпынку ставяцца, як і ў складаных сказах.

Перыяды ўжываюцца і ў паэзіі, і ў публіцыстыцы, і ў мастацкай прозе: *У яго галаве вынікаў цэлы клубок уражанняў гэтага дня: час выхаду на разведку, школа, дзе спыніўся штаб іх палка, таварышы і нейкія абрыўкі-з'явы нядаўна мінулага ваеннага жыцця, — усё гэта вынікала ў адзін момант (Я.Колас).*

## *М І Н І П Р А К Т Ы К У М*

***Заданне 1.***

1) Уважліва прачытайце тэкст (урывак з артыкула-роздуму) і знайдзіце ў ім адметныя экспрэсіўныя фігуры, назавіце іх.

2) Ці цалкам вы падзяляеце думку аўтараў? Паспрабуйце дапоўніць прачытаны тэкст уласнымі разважаннямі аб будучай настаўніцкай дзейнасці.

*Дзе сардэчнасць — там і дабрата, там і адсутнасць муштры. Там ніколі не госціць на ўроках і пасля ўрокаў, у школе і дома жах. Там не караюць вучняў двойкамі і абразлівымі запісамі ў дзённіках. Там настаўнік не ставіць двоек, троек і іншых адзнак, бо шануе і паважае асобу вучня — не толькі моцнага, а і слабейшага. Там, нарэшце, адсутнічае абразлівае, якое некім жа прыдумана, — «рабяты», а гучыць ветлівае і цёплае «дзеці», «дзеткі»... Так разыходзяцца промні Віткавай педагогікі — з яго сэрца на ўвесь свет, і ў іх святле паўстае дзіця — маленькае і большае, але ўсё роўна — у пачатку дарогі, роўнае ў сваёй безабароннасці перад жорсткасцю і нячуласцю і ў год, і ў дзесяць гадоў, напачатку самастойнага шляху з атэстатам сталасці ў руках (М.Шаўлоўская, М.Мішчанчук).*

***Заданне 2.*** У прыведзеных ніжэй афарызмах знайдзіце і назавіце фігуры павелічэння аб'ёму выказвання. Наколькі абумоўлена іх неабходнасць ужывання ў афарызмах? Адказ абгрунтуйце.

*1) Гаварыць многа і добра ёсць дар вострага розуму, гаварыць мала і добра ёсць уласцівасць мудраца, гаварыць многа і кепска вызначае дурня, гаварыць мала і кепска ёсць знак вар'яцтва (Ф.Ларашфука).*

*2) Ніякая навука не дае агню вачам і жывога румянцу шчокам, калі халодная душа дрэмле ў прамоўцы (М.Кашанскі).*

*3) Ёсць два роды балбатуноў: адны гавораць занадта многа, каб нічога не сказаць, другія ж гавораць занадта многа, але таму, што не ведаюць, што сказаць (В.Ключэўскі).*

*4) Дзе розум працуе, там сэрца адпачывае (С.Буфлер).*

*5) Разумно богачу смотреть на бедность,*
*А бедному — глядеть на богачей,*
*Им подражать, учась ценить богатство.*
*Счастливому полезно видеть горе. (Еўрыпід)*

*6) Пусть золото возьмут глупцы, а власть — злодеи,*
*Рабы удачи пусть трепещут перед ней;*
*Кто пашет землю, кто цветы лелеет,*
*Кто дерево растит — тот всех людей сильней. (Дж.Уіцьер)*

*7) Целая жизнь коротка для счастливых людей,*
*а несчастным*
*Даже и ночь-то одна неизменно долга. (Лукіан)*

*8) Участь нищего ... в том, чтоб жить, ничего не имея;*
*Участь бедного — быть бережливым всегда*
*и всегда быть прилежным в работе,*
*Нет избытка совсем у него, но зато не бывает*
*ни в чём недостатка. (Арыстафан)*

***Заданне 3.*** Прачытайце ўважліва ўрывак з Каляднага паслання мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта. Акцэнтуйце ўвагу на ўзмацненне экспрэсіі маўлення, на дарэчнае ўжыванне анафары, паліптота і полісіндэтона.

*Існінна, з намі Бог! Але ці з Богам мы, ці нарадзіўся ў нас Хрыстос-Емануіл, і мы, хто хрысціліся ў Хрысце, ці агарнуліся ў Хрыста, ці адрадзіліся ў Хрысце?*

***Заданне 4.*** Паспрабуйце прыдумаць і запісаць два прыклады з градацыяй: адзін — калі перадаецца эмацыянальнае напружанне і градацыя знаходзіцца ў межах аднаго сказа, а другі — калі паслабляецца эмацыянальна-сэнсавая выразнасць маўлення і градацыя арганізуе кампазіцыю ўсяго тэксту.

***Заданне 5.*** Прааналізуйце ўрывак з выступлення В.Быкава на пленуме Саюза пісьменнікаў Беларусі: якую асаблівасць сувязі сказаў вы заўважылі ў дадзеным тэксце. Назавіце гэтую экспрэсіўную сінтаксічную фігуру.

*Мастацтву падуладны ўсе бакі чалавечага існавання, і ў тым яго сіла. Але гэтая яго сіла — не нейкая вольная стыхія — у рэалістычным мастацтве яна мае свае вельмі канкрэтныя рысы і выдатна рэгулюецца вялікім крытэрыем — Праўдай жыцця. Праўда жыцця, абставін і паводзін чалавека ў пэўных жыццёвых акалічнасцях — вось магутны крытэрый нашага рэалістычнага мастацтва (В.Быкаў).*

**Заданне 6.** Уважліва прачытайце і запішыце па памяці мудры наказ паэта Р.Барадуліна нашчадкам. Якія экспрэсіўныя сродкі маўлення выкарыстаў паэт?

*Наведвайце бацькоў,*
*пакуль яны жывыя,*
*Пакуль дымяцца коміны —*
*нагрэйцеся ў бацькоў. (Р.Барадулін)*

**Заданне 7.** Прадоўжыце пачатыя тэксты (замест шматкроп'я напішыце прыклады згодна з камунікатыўнай устаноўкай пачатага маўлення).

*1) Антытэза ляжыць у аснове загалоўкаў многіх вядомых твораў. Успомнім, напрыклад: ...; ... ; ...;*

*2) Антытэза часта сустракаецца ў творах вуснай народнай творчасці. Колькі прыказак сваёй выразнасцю абавязаны гэтай экспрэсіўнай фігуры! Напрыклад: Горкая часам праца, ды хлеб ад яе салодкі; ... ; ... ; ... ;*

**Заданне 8.** Прыслухайцеся, як узнёсла, эмацыянальна гучыць верш. Якія сінтаксічныя сродкі экспрэсіі маўлення выкарыстала паэтэса Еўдакія Лось? Дайце свой варыянт загалоўка верша, паспрабуйце ўжыць у загалоўку вядомыя вам экспрэсіўныя фігуры:

*Радзіма*

*Радзіма пачынаецца з двароў,*
*Дзе журавель тырчыць, нібыта дрэўка.*
*Радзіма пачынаецца з вятроў,*
*Што падказалі першую запеўку...*
*Радзіма пачынаецца з вайны,*
*Што чвэрць народа некалі скасіла...*
*Яна — з тае ўсвядомленай цаны,*
*Што сам дасі лісточку дзівасіла...*
*Хвалююся, — і ведаю чаго, —*

*Хачу, каб помніў суайчыннік кожны:*
*Радзіма пачынаецца з таго,*
*Што не набыць, а страціць можна. (Е.Лось)*

**Заданне 9.** Прачытайце мудрую параду акадэміка Дз.С.Ліхачова для вашай настаўніцкай дзейнасці. Вызначце асноўную думку тэксту. Якія сінтаксічныя сродкі экспрэсіі маўлення выкарыстаў аўтар для таго, каб акцэнтаваць увагу на ідэі напісанага?

*Перш-наперш адна агульная заўвага. Каб навучыцца катацца на веласіпедзе, трэба ездзіць. Каб навучыцца пісаць, трэба пісаць! Нельга абставіць сябе добрымі рэкамендацыямі, як пісаць, і адразу пачаць пісаць правільна і добра: нічога не атрымаецца. Таму пішыце пісьмы сябрам, вядзіце дзённік, пішыце ўспаміны (іх можна і трэба пісаць як мага раней — няблага яшчэ ў юныя гады — пра сваё дзяцінства, напрыклад) (Дз.С.Ліхачоў).*

**Заданне 10.** Прааналізуйце ў ніжэйпрыведзеных тэкстах фігуры перыяду — разгорнутыя сінтаксічныя канструкцыі: вызначце экспрэсіўнае павышэнне і паніжэнне інтанацыі, сувязь і адносіны паміж імі, структурны тып сказа-перыяду.

*Калі былыя партызаны,*
*Калі рабочыя, майстры*
*Мантаж закончылі старанна*
*І трактар рушыў па двары, —*
*Яму ад сэрца ўсе жадалі*
*Шмат працавітых, шчасных год,*
*Каб казкі пра яго складалі,*
*Каб праслаўляў яго народ. (М.Танк)*

*Гляджу на ўсё ў радасным здзіўленні —*
*Як ластаўка гняздо старанна лепіць*
*І як шчупак у затоне ломіць аер,*
*Як дзед-садоўнік беліць ногі вішням*
*І песню пра Купалíньку пяе;*
*Як на світанні зоры паміраюць,*
*Каб нарадзіцца вечарамі зноў. (П.Панчанка)*

**Заданне 11.** Прыдумайце і запішыце ўласныя прыклады перыяду, пабудаваныя ў адпаведнасці з наступнымі схемамі:

*Мадэлі перыядаў з паралелізмамі і паўторамі:*

1) Перыяд азначальны: *Хто ... , хто ... , хто ... — той ... .*

2) Перыяд супастаўляльны: *Чым ... , чым ... , чым ... — тым ... .*

3) Перыяд умоўны: *Калі ... , калі ... , калі ... — то ... .*

4) Перыяд заключны: *настолькі ... , настолькі ... , настолькі ... — што ... .*

5) Перыяд уступальны: *Як ні ... , як ні ... , як ні ... — разам з тым ... .*

**_Заданне 12._** Паспрабуйце скласці і напісаць невялічкі эцюд, ужываючы экспрэсіўную сінтаксічную фігуру кальца. Выкарыстайце ў якасці рэфрэна адзін з прапанаваных варыянтаў:

*1) Болей душэўнай чуласці да сваіх вучняў!*
*2) Як хораша пачынаўся дзень!*
*3) Забыць цябе не маю сілы ...*
*4) Эх, залатыя гады студэнцтва!..*
*5) (Ваш варыянт)*

**_Заданне 13._** Знайдзіце ў мастацкай літаратуры, публіцыстыцы і запішыце прыклады анафары, эпіфары, паралелізму, полісіндэтону.

**_Заданне 14._** Прачытайце ўважліва ўрывак з апавядання-роздуму В.Віткі «Шчасце быць настаўнікам». Прааналізуйце ўжытыя экспрэсіўныя сродкі ў тэксце (выдзеленыя). Сфармулюйце і запішыце ўласныя высновы з прачытанага тэксту адносна вашай прафесіі.

*Дзень настаўніка, мабыць, адзін з тых нямногіх дзён, калі выпадае вольная часіна сабрацца не толькі* ***дзеля*** *адпачынку, а і* ***дзеля*** *таго, каб пачуць слова ўдзячнасці* ***ўсім тым дням****,* ***усім тым будням****, з якіх складаецца жыццё, праца і ўвесь клопат настаўніка.*

*Сапраўдным настаўнікам можа быць толькі* ***чалавек*** *самага чулага сэрца,* ***чалавек*** *адметны шчырасцю, праўдзівасцю* ***сваіх*** *перакананняў,* ***сваёй*** *нястомнай прагнасцю* ***да*** *новага,* ***да*** *адкрыццяў,* ***да*** *пазнання свету,* ***чалавек****, які самаахвярна аддае душэўныя багацці і веды людзям.*

*Можа быць, гэта і ёсць той адзіны крытэрый, які вызначае настаўніка:* ***ці ёсць у цябе*** *вучні,* ***ці ёсць у цябе*** *паслядоўнікі,* ***ці ёсць у цябе*** *сябры, якім хочацца не толькі вучыцца* ***ў цябе****, вывучаць* ***твой*** *вопыт, але і пераймаць* ***твае*** *чалавечыя якасці? Гэта пытанне рана ці позна абавязкова задае сабе кожны чалавек, незалежна ад таго,* ***якую*** *прафесію,* ***якую*** *спецыяль-*

*насць ён мае. Самае вялікае шчасце быць паэтам сваёй працы, любіць* ***яе,*** *верыць, што* ***яна*** *самая патрэбная людзям (В.Вітка).*

***Заданне 15.*** Уявіце сабе сітуацыю: хутка праляцелі залатыя гады студэнцтва, наперадзе час настаўніцкай працы. І вось вы развітваецеся са сваёй навучальнай установай, выкладчыкамі, сябрамі, горадам — і гаворыце апошнія словы развітання: *«Бывай, мой сябра універсітэт! Ты даў мне многа: цікавыя карысныя веды, добрых і надзейных сяброў і, галоўнае, веру ў абраную мной прафесію. І колькі б ні было мне гадоў, якія абставіны ні складаліся б, я заўсёды буду з цеплынёй у душы і пяшчотай у сэрцы, у думках вяртацца сюды. Я ўдзячна табе за ўсё...»* Працягніце думку (5-7 сказаў), узмацніце ўласны тэкст экспрэсіўнымі фігурамі (напрыклад, градацыяй, падваеннем слоў, выразаў, полісіндэтонам і інш.).

***Заданне 16.*** Знайдзіце ў прапанаваных урыўках з мастацкай літаратуры, публіцыстыкі ўсе выпадкі ўжывання экспрэсіўных сінтаксічных фігур павелічэння аб'ёму выказвання. Назавіце іх. Абгрунтуйце неабходнасць экспрэсіі ў тэкстах.

1) *Запяі мне песню не з мяшчанскіх вулак,*
*не з вялікіх сцэнаў, не з эстрад,*
*запяі мне тую, што я сэрцам чула,*
*калі асыпаўся белы сад.*
*Запяі мне тую, што пяяла няня*
*над калыскай, доўга не сплючы... (Л.Геніюш)*

*2) — Ой, не пайду замуж за цябе: не трэба мне золата-серабра, не трэба багатага малайца. Я кахала аднаго — кахаць буду; цалавала аднаго — цалаваць буду. Ён у цябе парабкам служыць, па мне заўсёды тужыць...*
*Кланяўся пан нізка да зямлі — не памагло.*
*Кленчыў, як той жабрак пад акном, — не памагло.*
*Ой, шчасце не ў золаце, паны! (З.Бядуля)*

*3) а) Вы разумееце, што гэта — палітычная памылка, правакацыя, і нават, скажам, больш таго — ідэалагічная дыверсія (З газет).*
*б) Не магу пагадзіцца, што мы кепска працуем. Такія заявы крыўдзяць нашых рабочых, абражаюць (З газет).*

4) *Нашто табе мая самота?*
*Нашто табе мая любоў?*
*Сярод каханак і сяброў*

*Нашто табе мая самота?*
*Мо на абрыве адзіноты*
*Сябе перапытаеш зноў,*
*Нашто табе мая самота,*
*Нашто табе мая любоў... (В.Русілка)*

5) *Трэба кланяцца зале.*
*Зале, амаль пустой. (В.Русілка)*

6) *Што ж ты хочаш яшчэ,*
*Блакада?*
*Патрабуеш яшчэ*
*чаго?*
*У глухмені балотных кладак*
*Ты забрала бацьку майго,*
*Ты забрала мой смех,*
*Блакада. (Р.Барадулін)*

7) *Сэрца мудрых — у доме плачу.*
*Неразумных — у доме балю. (Р.Барадулін)*

*8) Невысокі хударлявы чалавек размеранаю роўнаю хадою ідзе лесам. Лес, ахінуўшы свае плечы белаю накідкаю, урачыста захоўвае цішыню і спакой. Такі лагодны спакой бывае толькі ў мінуты мудрага разважання... (Я.Колас)*

*9) Адвечная рана, якая перадавалася ім з пакалення ў пакаленне, на час зрасталася.*

*Іначай і быць не магло. Бо іхняе жыццё на зямлі пана Магдановіча цягнулася, як доўгая, лагодная песня, дзе кожная страфа мела дванаццаць радкоў, і толькі апошняе слова дванаццатага радка было бурлівае, трывожнае, якое хапала за сэрца...*

*Іначай і быць не магло. Бо ўжо болей ста гадоў, як яны тут жывуць. Ужо разы тры-чатыры будынкі нанова перабудоўваліся за гэты час. Ужо тры-чатыры разы мяняліся гаспадары, мяняліся паны ад бацькоў да сыноў. У іх ёсць нават свой магільнічак на пагорку, дзе над пагніўшымі, аброслымі мохам крыжамі шумяць матулі-елкі.*

*Іначай і быць не магло. Бо, здаецца, тыя самыя салоўкі, жаваранкі і вераб'і, што спявалі песні калісьці іх дзядам, калі тыя гнулі свой карак над сахой на роднай глебе, пяюць і цяпер старадаўнія песні. Тое самае сонейка свеціць ім удзень, тыя самыя зоркі і месячык мігацяцца ўночы; тыя самыя песні пяюць іхнія жнеі на полі і начлежнікі на расцяробе...*

*Іначай і быць не магло. Бо сэрцы і думкі іхнія ўраслі ў гэты кавалак зямлі, што завецца Такароўшчынай, глыбокімі карэннямі. А вочы, здаецца, аслеплі б без гэтых садочкаў, без гэтага поля і без сіне-блакітных далей, якія акружаюць з усіх бакоў Такароўшчыну (З.Бядуля).*

*10) І ты зусім не аб тым,*
*І я зусім не пра тое...*
*Плыве цыгарэтны дым*
*І вочы горкай слязою. (В.Русілка)*

*11) Навучыла маці рожу замаўляці,*
*навучыла маці вогнік адліваць,*
*ворагаў ўсялякіх для спакою ў хаце,*
*а таёмны вецер навучыў кахаць. (Л.Геніюш)*

*12) У белай пене праносяцца коні, —*
*Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць...*
*Старадаўняй Літоўскай Пагоні*
*Не разбіць, не спыніць, не стрымаць. (М.Багдановіч)*

*13) Была ноч, і былі мы, здавалася, адны на белым свеце. Мы былі ў ночы, ноч была ў нас (В.Казько).*

*14) Сымоніха паклікала знахара — ён шаптаў, шаптаў, курыў, курыў, даваў зелля ўсялякага, стараўся-ткі, праўду сказаць; а парсюк уночы — хірк, хірк і ... даўся (З.Бядуля).*

*15) — Пахаваў жонку, пагарэлі на пажары дзеткі, пагарэла дабро, і хатка, і конікі, і кароўкі, і ўсё. А зямелька неўрадліва мая ... (М.Гарэцкі).*

*16) Ёсць час наш і час даўнейшы, час залаты і час пракляты, час доўгі, час кароткі. Адзін у свой час быў вялікім чалавекам, а ў нашы часы нічога не варт. Другі стаў бы вялікім чалавекам, але ён не мае часу, каб заняцца сваёю вялікаю справаю. Адзін не мае часу носа ўцерці за работаю, а другі ные ад таго, што не ведае, куды яму дзець лішні час. Ёсць людзі, якія «ўбіваюць» час, скарыстоўваюць час, нават папярэджваюць час і проста марна трацяць час (К.Крапіва).*

*17) Не судзіце, каб вас не судзілі, бо, якім судом судзіце, такім і вас судзіцьмуць, якою меркаю мерыце, такою і вам адмерыцца. І што ты глядзіш на трэсачку ў воку брата твайго, а калоды ў воку тваім не адчуваеш?..*

*Прасіце, і вам дасца; шукайце, і знойдзеце; стукайце, і адчыняць вам, бо кожны, хто просіць, атрымае, і хто шукае, знаходзіць, і хто стукае, таму адчыняюць. Ці ёсць сярод вас такі чалавек, які, калі сын у яго папросіць хлеба, падаў бы яму камень?*

*І ва ўсім, як хочаце, каб людзі рабілі з вамі, так і вы рабіце з імі, бо ў гэтым закон і прарокі.*

*Уваходзьце праз цесную браму,*
*бо шырокая брама і прасторная дарога*
*вядуць у пагібель,*
*і многія ходзяць імі.*
*Бо цесная брама і вузкая дарога*
*вядуць у жыццё,*
*і нямногія знаходзяць іх. (Евангелле паводле Мацвея.*
*З Нагорнага казання.)*

*18) Паслухалі тое старцы, галовамі паківалі, узяліся за струманты ды і зайгралі. Першы раз зайгралі — Іванку розум далі; другі раз зайгралі — у сэрца жаласці нагналі; трэці раз яны зайгралі — язык Іванку развязалі (з народнай казкі «Іван-прастачок»).*

*19) Толькі маўчыць, маўчыць*
*усявышні,*
*І ты маўчыш у далёкай*
*сталіцы.*
*І зона здзічэла маўчыць*
*у заціішы,*
*Маўчаць палеткі, лясы і*
*крыніцы. (А.Грачанікаў)*

*20) Я не заплачу па табе,*
*Не пракляну ніводным словам...*
*Бывай, мой сябра выпадковы,*
*Я не заплачу па табе. (З.Марозаў)*

*21) Будзь здароў, Краю мой, я малюся*
*за сям'і свае змучанай кроў*
*сэрцам, п'яным маёй Беларуссю,*
*будзь здароў, Краю мой, будзь здароў... (Л.Геніюш)*

*22) Родны край ніхто не выбірае.*
*Выбірае родны край цябе. (Р.Барадулін)*

*23) Дзякуй табе, мая любая, я ж і не ведаў, і не падазраваў, не здагадваўся нават, што ты хаваеш у сваім старэнькім вішнёвым чамаданчыку, ды і не звяртаў, прызнацца, на яго ўвагі, а можа, і ўпершыню ўбачыў, калі ты мне сёння яго паказала. (В.Вітка)*

24) *Кто ищет истину, держись*
*у парадокса на краю;*
*вот женщины: дают нам жизнь,*
*а после жить нам не дают. (І.Губерман)*

*25) Птаха хапае і на зямлю, і на неба, і хоць хата для птаха — зямля, на ёй ён спутаны, на ёй ён «пехацінец», які мусіць думаць пра тое, каб напакаваць свой «хатуль» і каб займець свой кажух (А.Разанаў).*

*26) Надвор'е на возеры часта змяняецца. То цёпла, то холадна. То свеціць сонца, то пахмурна. То ціха, то рэзкі вецер (В.Вольскі).*

*27) Шчасце не мае сваёй асобнай меркі для ўсіх людзей на свеце, але кожны чалавек мае сваю асобную мерку да шчасця і свой асобны погляд на самое шчасце ... (З.Бядуля).*

*28) Клён усё памятаў. Ён памятаў той далёкі-далёкі дзень, калі ў лес прыйшоў чалавек з рыдлёўкаю і, асцярожліва падкапаўшы кволыя карэньчыкі, панёс яго ў вёску, каб стаць яго першым гаспадаром (У.Арлоў).*

29) *Малю:*
*«Касцёр! Гары, гары...»*
*А ён паціху*
*памірае...*
*А ён паціху памірае ...*
*А ён паціху памірае ... (Н.Загорская)*

*30) Звоняць званы Хатыні... Звоняць над спаленымі хатамі, над жыццямі людзей, што ведалі свабоду і шчасце. Звоняць над брацкай магілай аднавяскоўцаў, над магіламі дзяцей, свет для якіх яшчэ не ўспрымаўся далей навакольнага лесу.*

*Звоняць званы над могілкамі 136 вёсак, дзе не засталося ніводнай сям'і, дзе не збудавана на папялішчы ніводнай новай хаты... Назвы спаленых вёсак засталіся толькі ў памяці народнай ды на магільных плітах Хатыні — на могільніку вёсак.*

*Звоняць званы над мемарыяльнай картай Беларусі, на якую занесены сотні і іншых спаленых, а потым адноўленых вёсак.*

*Звоняць званы Хатыні. Звон іх зліваецца з Бухенвальдскім набатам, з жалобнай музыкай над магіламі ахвяр Лідзіцэ і Арадура — і гучыць як палымяны заклік: «Людзі, будзьце пільныя!» (І.Шамякін)*

*31) Вось, мёртвае ажыло.*
*І вось, жывое змярцвела. (А.Разанаў)*

## II. ФІГУРЫ ПАМЯНШЭННЯ АБ'ЁМУ ВЫКАЗВАННЯ

Названая група фігур звязана з рознымі трансфармацыямі аб'ёму выказвання, у прыватнасці, з пропускам пэўных маўленчых адзінак, а таму і памяншэннем аб'ёму выказвання. Фігуры памяншэння аб'ёму выказвання надаюць маўленню энергічнасць, даволі часта выкарыстоўваюцца ў лозунгах і газетных загалоўках, ствараюць такое ўражанне, што адрасат рашуча пераходзіць ад слоў да справы. Да гэтых экспрэсіўных сінтаксічных фігур адносяцца: 1) эліпсіс; 2) умаўчанне; 3) асіндэтон; 4) зеўгма.

**1. Эліпсіс** (ад грэч. *ellepsis* — пропуск, недахоп*)* — сінтаксічная фігура, у якой прапускаецца выказнік, які не з'яўляецца неабходным для перадачы пэўнага паведамлення. Такі сказ з'яўляецца семантычна поўным, таму эліптычная канструкцыя выйграе ў дынамізме і нічога не губляе ў зразумеласці: *Любы тур у любую краіну свету! (з газет).*

Пры дапамозе эліпсісу дэманструецца экспрэсія, выказванню надаецца большая энергія, дынамічнасць, напружанасць дзеяння, душэўны, псіхалагічны стан персанажа. У эліптычных канструкцыях выказнік канкрэтна лексічна не названы, але яго семантыка даволі лёгка вызначаецца са сказа: *Узбоч дарогі — лясок, па другі бок — поле, а ўгары папялістыя хмары паўзуць (Я.Колас); У цёмным небе карагоды сінявокіх зорак (М.Багдановіч).*

Структурная «непаўната» эліптычных канструкцый перш-наперш абумоўлена кантэкстам: *Яму ён гаворыць адно, а мне — зусім іншае*, сітуацыяй (адзнакі на экзамене): *Іванову — пяць, а Пятрову — тры*, здольнасцю вядомых канструкцый размоўнага стылю мець незамешчаныя сінтаксічныя пазіцыі: *Я — дахаты. Ён — ні слова.*

Эліпсіс часта выкарыстоўваецца ў адзінстве з паралелізмам і антытэзай. Напрыклад: *Каму густа, а каму пуста (прыказка); Прыгожы — на грэх, а дурны — на смех (прыказка).*

**2.** У адрозненне ад эліпсісу, **умаўчанне** дапускае пропуск таго, што вельмі значна. Гэта сінтаксічная фігура, пры якой маўленне знарок рэзка абрываецца, каб перадаць пэўныя эмоцыі гаворачага; зразумелым становіцца толькі самы агульны сэнс выказвання. Умаўчанне разлічана на своеасаблівае садуманне чытача ці слухача з адрасантам выказвання. У маўленні гэтая фігура падкрэсліваецца інтанацыйна, а графічна абазначаецца шматкроп'ем. Умаўчанне вы-

карыстоўваецца ў размоўным, мастацкім і публіцыстычным стылях для ўзмацнення экспрэсіі маўлення: *Ведаючы яе натуру, то можна пэўна думаць, што ўжо даўно недзе на фронце пад кулямі ды снарадамі байцоў нашых раненых лечыць. А можа і сама ўжо недзе...* ***не дай Божа****... (А.Кулакоўскі).*

Такім чынам, умаўчанне па форме – няпоўная, недасказаная фраза, якая ўжываецца для таго, каб абудзіць фантазію суразмоўцы, перадаць вострыя перажыванні, моцную ўсхваляванасць. Так, напрыклад, у рамане «Трэцяе пакаленне» К.Чорны паказвае спалоханасць краўца, калі той сустрэўся ў лесе з бандытамі: — ***Братачка****... (кравец праз сілу выдыхнуў з грудзей).* ***Я... братачка...*** *Адкуль жа вы, братачка, ведаеце, што я на тым тыдні шыў у Ярмалінскага? (К.Чорны).*

Шырока выкарыстоўваў экспрэсіўную сінтаксічную фігуру ўмаўчання Змітрок Бядуля. І калі з ужываннем дзеяслоўных формаў паскараецца хуткасць падзей, то паўзы, умаўчанні нечакана «разрываюць» размераны, запаволены тэмп апавядання і ствараюць эфект «арытміі», адпаведнай узрушанаму стану душы аўтара і герояў. У некаторых абразках гэты прыём сустракаецца ў шматлікіх выпадках:

*Ці я вінават?..*

*Думы, дзеці душы маёй, мне спакою не даюць.*

*Ці ўжо мо' пад гэткай планетай дзяцюк нарадзіўся?..*

*Ці мо я сам вінават у нядбаласці сваёй?..*

*Саху ў рукі я не бяру; сякера вышчарбілася, нават і лучыны пашчапаць ахвоты нямашака. Суседзі смяюцца, што мазалёў як бы не было на руках маіх.*

*От, пазіраў-бы, як сонейка на балоце заходзіць і стагі залоціць... Як конюх плача над яварам... Цягаўся б начамі па хвойніку, апусціўшы галаву на грудзі, заламаўшы рукі на плечы... Заўсёды ад маладзіка да ветаха гэтак рабіў бы... (З.Бядуля)*

Як асобы тып умаўчання ужываецца **прасіяпез** — пропуск пачатковай часткі выказвання, адрэзку маўлення, тэксту, што папярэднічаюць дадзенаму выказванню. Прапушчаны адрэзак маўлення звычайна лёгка ўзнаўляецца дзякуючы вядомым чытачу фразеалагізмам, прыказкам і сітуацыям. Фігуры ўласціва таксама асаблівая інтанацыя ў пачатку выказвання, а на пісьме ёй звычайна папярэднічае шматкроп'е. Прасіяпез выкарыстоўваецца ў загалоўках тэкстаў, у тым ліку і рэкламных, выконваючы інтрыгуючую функцыю: *... І я скажу, хто вы; ... Не церпіць адзіноты, ...плюс добрая якасць (з газет).* Часам могуць прапускацца пачатковыя словы ва ўстойлівых словазлучэннях (ужыванне імя па бацьку *Аляксандравіч,*

*Сяргееўна* замест поўнай формы імя і імя па бацьку: *Іван Аляксандравіч, Ганна Сяргееўна).*

Існуе і супрацьлеглы прасіяпезу тып умаўчання — **апасіяпез** (недагаворванне канца фразы). Напрыклад: *Люблю кіно, але...; У ходзе праверкі аказалася...; Я вас...; Глядзі мне...; Толькі паспрабуй...* і інш. Гэта або стандартныя формулы эмацыянальна-валявога маўлення, або незакончаныя сказы, якія вымаўляюцца з асаблівай інтанацыяй папярэджвання, пагрозы і г.д.

**Заўвага.** *Ад умаўчання варта адрозніваць выпадкі ўсхваляванага, спантаннага маўлення, калі чалавек не можа сабрацца з думкамі, засяродзіцца. Напрыклад: я ... гэта ... як яно называецца... Такая пабудова сустракаецца ў размоўным стылі і дапушчальна пры яго стылізацыі ў мастацкім. У публіцыстыцы падобныя канструкцыі ацэньваюцца як паказчык нізкай маўленчай культуры.*

**3. Асіндэтон** (ад грэч *asyndeton* — нязведанае, бяззлучнікавасць) або **бяззлучнікавасць** — сінтаксічная фігура, у якой адсутнічаюць злучнікі паміж граматычна аднароднымі словамі і сказамі з мэтай узмацнення экспрэсіі, дынамічнасці, насычанасці з’яў, падзей, фактаў. Такая будова фразы або вершаванага радка надае мове сцісласць, большую выразнасць, энергічнасць, узмацняе экспрэсіўнасць:

*Попел і чорныя цені майна,*
*Вые ў комінах скруха.*
*Як называюцца слёзы? —*
*Вайна.*
*Смерць.*
*Галадоўка.*
*Разруха. (Я.Янішчыц)*

Асіндэтон дапамагае перадаць хуткую змену з’яў і падзей, суправаджаецца характэрнай пералічальнай інтанацыяй:

*Камароўка, Грушаўка, Чыжоўка,*
*Старажоўка, Ляхаўка, Людамант...*
*Чуецца яшчэ ў гаворцы слоўка,*
*А пасля забудзецца з гадамі... (В.Вітка)*

Фігура, якая супрацьлеглая асіндэтону, — полісіндэтон, або шматзлучнікавасць. Але сустракаюцца выпадкі, калі абедзве гэтыя фігуры аб’ядноўваюць. Напрыклад: *Трава і дрэва, рыба і звер — усё расце і водзіцца ў гэтым дзікім куточку (І.Шамякін); А лес! Не*

*налюбавацца гэтым лесам! Высокі, густы, сакавіты, поўны радасці, смеючыся тысячамі смехаў, які блукаў і на яго камлях, і на яго галінах, і на кожным лісціку, стаяў ён воддаль, побач з ракою, расступаючыся перад ёю, як перад красуняю, і пачціва звешваў над ёю жывую зялёную павець (Я.Колас).*

**4. Зеўгма —** сінтаксічная фігура, у межах якой да аднаго апорнага слова адносяцца два або больш слоў, якія раўнапраўныя граматычна,але абсалютна адрозныя паміж сабой семантычна. Менавіта гэта дае магчымасць успрымаць далёкія і лагічна не аднародныя паняцці як аднародныя члены. Напрыклад: *Хлеб **есца, смокчацца, грызецца, «хлябаецца»** і генетычна **памятае** свой радавод, сваю бацькаўшчыну — глебу (А.Разанаў).*

Або:

*У цябе на слыху перагукваюцца*
***Радыяцыя** і **радаўніца**.*
*Чакаючы ў гнёзды буслоў,*
*Дагніваюць на ліпах бароны. (Р.Барадулін)*

Характэрнымі для зеўгмы з'яўляюцца гіпербалічныя завастрэнні, а таму абгрунтавана яе ўжыванне ў гумарыстычных мініяцюрах: *Адны сустракаюць Новы год **з надзеяй**, другія — **з каханнем**, а трэція — **з жонкай** (Б.Васільеў),* у пародыях і эпіграмах: *Прапах **архівамі і мятай** І не запах ад хрэстаматый ... (з эпіграмы Р.Барадуліна на А.Лойку).* Названая фігура часта выкарыстоўваецца для выражэння іроніі або камічнага: *На дварэ стаяла цудоўнае летняе **надвор'е** і **дзяўчына** ў паркалёвай сукенцы; Ішоў **дождж** і два **студэнты*** і інш.

## *М І Н І П Р А К Т Ы К У М*

***Заданне 1.*** Складзіце вельмі кароткае выступленне з загадам якога-небудзь дзеяння. Выкарыстайце абавязкова фігуры памяншэння аб'ёму выказвання. Чаму яны так неабходны ў вашым тэксце?

***Заданне 2.*** 1) Успомніце і запішыце такія назвы твораў, дзе шматкроп'е абазначае ўмаўчанне. «Расшыфруйце» адно з іх.

2) Паназірайце, ці ёсць умаўчанні ў вашым вусным і пісьмовым маўленні.

3) Напішыце мініяцюру на любую вольную тэму, ужываючы ў ёй умаўчанне.

**Заданне 3.** Знайдзіце ў творах мастацкай літаратуры выпадкі адначасовага выкарыстання асіндэтона (бяззлучнікавасці) і полісіндэтона (шматзлучнікавасці). Што супрацьпастаўляецца ўжываннем гэтых фігур?

**Заданне 4.** Знайдзіце ў прапанаваных прыкладах усе выпадкі ўжывання экспрэсіўных сінтаксічных фігур памяншэння аб'ёму выказвання, а таксама іншых, ужо вядомых вам фігур. Падумайце і дакажыце неабходнасць экспрэсіі ў сказах:

*1) Не плакаў я — усім на злосць,*
*Бо ў хаце быў адзін — мужчына.*
*Не йшоў ты...*
*Маці маладосць*
*глыбей заворвалі маршчыны. (Р.Барадулін)*

*2) Ўсё, што цешыць, і ўсё, што баліць,*
*на палотны узорам раскіну:*
*хвалі, краскі, калоссе, палі —*
*ўсю красу наймілейшай Краіны!.. (Л.Геніюш)*

*3) На самым версе стогадовага дуба невялічкае гняздо нейкай залётнай птушкі. (І.Навуменка)*

*4) Вісіць над сэрцам і над сінім верасам*
*Мядовы пах жыцця і пчолаў гуд. (П.Панчанка)*

*5) Яна рукаўком — слёзы ручайком,*
*Яна рукою — слёзы ракою. (З народнай песні)*

*6) ... і вось дачакаліся. (з газет)*

*7) І старшына ім выдасць*
*Удосталь махоркі і сноў. (Г.Бураўкін)*

*8) Правінцыя... Хатка... Бярозка...*
*Гаік, масточак, рачулка, касьцёлік.*
*Правінцыя... Жыта палоска...*
*Цэркаўка... Груша дзічка. Вярба. (В.Шалкевіч)*

*9) На звычайнай лясной паляне звычайная старая леснікова хата (Я.Брыль).*

*10) Бярозавая светласць,*
*Асінавая сінь,*

*Рабінавая ветласць,*
*Кляновая цяплынь,*
*Ліпнёвая лагода...*
*Шмат сонечнасці ў дрэў,*
*Ля іх душа заўсёды*
*Становіцца мудрэй. (З.Марозаў)*

11) *Улада ж столькі сваіх абяцанняў не выканала... (З газет)*

12) *Ты пойдзеш у бой, а я плуг пакірую,*
*Каня накармлю, напаю —*
*і так абаронім, засеем, збудуем*
*Беларусь дарагую сваю. (Л.Геніюш)*

13) *Будзем жыць ці далёка, ці блізка,*
*Хай нас лучыць пакуль перапіска —*
*Ўсё па той жа простай прычыне...*
*Ты на нас не гневайся, сыне.*
*Можа, толькі некалі, можа...*
*Дай жа, Божа!.. (У.Шахавец)*

14) *«Ляксандравіч, нешта ты нас*
*забыў,*
*У госці не едзеш другое лета.*
*Ты ж мясцінку нашу любіў*
*І затонне прыпяцкае гэта.» (А.Грачанікаў)*

## III. УЛАСНАРЫТАРЫЧНЫЯ ФІГУРЫ

Уласнарытарычныя фігуры (ад грэч. *rhetor* — аратар, прамоўца, лац. *figura* — знешні выгляд, вобраз) — даволі распаўсюджаныя сінтаксічныя фігуры, якія ўжываюцца для стварэння ўрачыстых, узнёслых, паэтычных кантэкстаў, узмацнення выразнасці маўлення. Эфект дасягаецца за кошт выкарыстання сінтаксічных адзінак з яркай эмацыянальнай афарбоўкай. Функцыя фігур названай групы — эмацыянальна-камунікатыўная. З іх дапамогай аўтар актыўна ўздзейнічае на адрасата, навязваючы яму сваё ўспрыняцце свету, пазбаўляючы яго самастойнасці ў ацэнцы з’яў, фактаў, падзей.

Да ўласнарытарычных фігур адносяцца: 1) рытарычнае пытанне; 2) рытарычны зваротак; 3) рытарычны вокліч.

**1. Рытарычнае пытанне** — сінтаксічная фігура, у якой сцвярджаецца або адмаўляецца з мэтай большай экспрэсіўнасці пытанне, якое не патрабуе адказу ад чытача ці суразмоўцы:

*Ці ж сніў, ці ж бачыў я тады,*
*у красавіцкі ранак стылы,*
*што ад чарнобыльскай бяды*
*пакіну родныя магілы? (М.Стрыгалёў)*

Рытарычнае пытанне — сказ, пытальны па структуры, які перадае, як і апавядальны сказ, звесткі, паведамленне пра што-небудзь. Такім чынам, у рытарычным пытанні назіраецца супярэчнасць паміж формай (пытальная структура) і зместам (значэнне паведамлення). Паведамленне ў рытарычным пытанні заўсёды бывае звязана з выражэннем разнастайных эмацыянальна-экспрэсіўных значэнняў. Іх асновай з'яўляецца тое, што рытарычныя пытанні ўзнікаюць заўсёды ва ўмовах супрацьдзеяння як эмацыянальная рэакцыя пратэсту. Менавіта таму для рытарычных пытанняў характэрна таксама супярэчнасць паміж формай і зместам па прынцыпу сцверджанне — адмаўленне. Так, сказы, адмоўныя па форме, перадаюць сцвярджальнае паведамленне: *Але не — беларус умее працаваць, ці не яго мазалістымі рукамі праведзены бадай усе чыгункі ў Расіі? (М.Гарэцкі).*

І наадварот, у сказах са сцвярджальнай формай адмаўляецца тое, пра што пытаецца:

*З чым жа, маці азёр беларускіх,*
*Мог я ў песні цябе параўнаць? (П.Прыходзька)*

У сказе выражана адмаўленне: *ні з чым нельга параўнаць маці азёр беларускіх.* Менавіта на гэтай неадпаведнасці сінтаксісу і інтанацыі грунтуецца экспрэсіўная сіла ўздзеяння рытарычнага пытання.

У якасці рытарычных фігур могуць ужывацца сказы разнастайнай пытальнай структуры: з займеннікавым пытальным словам: ***Якое** ж вяселле без песні? (А.Астрэйка)*, з пытальнай часціцай: *Рыбачко, Хадосечко!.. **Ці** ж мы не глядзелі цябе, як вока сваё! Не любілі, не шкадавалі **хіба?!** (І.Мележ)*, без спецыяльных пытальных слоў: *Ты чуеш, дружа мой, як плачуць журавы над зарывам асенніх журавін? (П.Панчанка).* Сустракаюцца і клічныя сказы з часціцай *не*, у якіх ёсць словы *хто*, *што* , *які, як* і г.д.: *Асенні лес... **Хто не** любаваўся яго харáством! (А.Александровіч).*

У тэксце можна сустрэць некалькі побач размешчаных рытарычных пытанняў, выразнасць якіх можа быць узмоцнена анафарай ці эпі-

фарай: ***Каму не зразумела**, што не ўсе людзі на Зямлі роўныя?!* ***Каму не зразумела**, што род чалавечы адзіны?! (А.Куніцын).*

Рытарычнае пытанне, як ужо адзначалася вышэй, не патрабуе адказу, але ад значэння самога ўласна пытання ў названай сінтаксічнай фігуры захоўваецца ўстаноўка гаворачага на жаданую ў адказ рэакцыю суразмоўцы або тых, да каго звернута маўленне. Значэнне паведамлення не з'яўляецца асноўным значэннем пытальнай структуры, таму для яго праяўлення патрабуюцца іншыя ўмовы. Сярод іх, у прыватнасці, вызначальная роля надаецца інтанацыі, кантэксту, у які ўключаны пытальны сказ, метафарычнаму значэнню лексічнага складу слова, не ўласціваму ўласна пытанню.

Пасля рытарычнага пытання ў канцы сказа ставіцца пытальны знак (?), дапушчальны клічны (!) і, значна радзей, спалучэнне гэтых абодвух знакаў (?!).

**2. Рытарычны зваротак** — такая арганізацыя маўлення, дзе зварот мае павышаную экспрэсію і выражае разнастайныя эмацыянальныя ацэнкі. Ствараецца сітуацыя свабоднага суб'ектыўнага выказвання. Форма звароту выкарыстоўваецца ў гэтай сінтаксічнай фігуры не столькі для таго, каб назваць адрасата, колькі для прыцягвання ўвагі да гэтага адрасата з боку іншых асобаў. Менавіта таму рытарычны адрасат нічым не абмежаваны: ім можа быць і той, хто не прысутнічае пры акце маўлення, і тое, што не валодае дарам маўлення (неадушаўлёныя прадметы, з'явы, прырода, літаратурныя персанажы і інш.). Напрыклад: *Мір табе, **залатая зямля**! (П.Глебка), Дзень добры, **юная вясна**! (Я.Колас).*

Рытарычны зваротак шырока выкарыстоўваецца ў паэтычным маўленні:

***Слова маё!***
*Я ў цябе не прашу*
*Ні славы, ні ўзнагароды.*
*Ціха і проста зайдзі у душу*
*І застанься там...*
*назаўсёды... (Г.Бураўкін)*

Рытарычны зваротак можа быць узмоцнены ўвядзеннем займенніка і паўтору слоў: ***Ой ты, мая рыбка**, спі, залатая! (Я.Колас),* ***О вецер, вецер**, не дзьмі безустанку! (Я.Купала),* ***Хмаркі, хмаркі** дарагія, напаіце дожджыкам зямлю! (Я.Колас).*

Сваю рытарычную ролю выконвае і звычайны сінтаксічны зваротак у пачатку маўлення: *Шаноўнае спадарства! Дарагія сябры!*

Часам зваротак можа апускацца, але ён лёгка ўзнаўляецца і выконвае сваю функцыю: *Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! (Ф.Багушэвіч).*

**3. Рытарычны вокліч** — гэта эмацыянальна афарбаваны сказ, у якім эмоцыі, нават не выражаныя лексічнымі і сінтаксічнымі сродкамі, абавязкова выражаны інтанацыйна: *Колькі пісалі і будуць пісаць пра Хатынь, пра знямелага ў сваім горы бацьку! (В.Вітка)*

Або:

*О, колькі б тайнаў нам адкрыла слова,*
*Калі б знайшоўся летапіс такі! (І.Багдановіч)*

Рытарычныя воклічы павышаюць эмацыянальны ўзровень маўлення, часам надаюць яму дыялагічную форму: *Усе сілы і сродкі — на ахову прыроды! (з газет).* Гэта і ёсць заклік. А часам сустракаюцца формы сцвярджэння нацыянальнай ідэі: *Жыве Беларусь! Жыве Бацькаўшчына!*

Такім чынам, рытарычны вокліч — сцвярджэнне таго ці іншага паняцця, з'явы, факта, дзеяння, яго павышанай эмацыянальнай значнасці ў форме вокліча. Таксама, як і рытарычнае пытанне, вокліч стварае інтанацыйны, эмацыянальны і вобразны акцэнт у тэксце:

*Хай свеціцца імя Тваё,*
*Беларусь,*
*У стронцыі, цэзіі, ліціі! (Р.Барадулін)*

*Хай жа зялёнымі хвалямі, жытам рунеецца час! (А.Звонак),А што за ягады лясныя ў нас адразу зацвілі! (П.Глебка).*

## *М І Н І П Р А К Т Ы К У М*

***Заданне 1.*** Прачытайце пачатак тэксту. Падумайце, якая роля ў яго будове належыць рытарычнаму пытанню. Якім чынам у тэксце ўдалося пазбегнуць неапраўданага паўтору слова *рамонкі*?

*Рамонкі*

*Хто не ведае гэтых простых лугавых і лясных мілых кветак? Ідзеш, бывала, у лес па пратаптанай, даўно знаёмай сцяжынцы...*

1) Працягніце тэкст.

2) Напішыце зачын сачынення на любую цікавую вам тэму і абавязкова выкарыстайце напачатку для сувязі загалоўка і тэксту рытарычнае пытанне.

**Заданне 2.** Знайдзіце і запішыце рытарычныя звароткі і воклічы, рытарычныя пытанні ў «залатым слове» Святаслава («Слова пра паход Ігаравы»).

**Заданне 3.** Паспрабуйце сфармуляваць рытарычныя пытанні, звароткі, воклічы на наступныя тэмы:

*1) У кожнага з нас ёсць запаветная мара.*
*2) Люблю свой край.*
*3) Залатыя гады студэнцтва.*
*4) Што значыць быць сучасным?*
*5) (Ваш варыянт).*

А цяпер складзіце тэкст невялікага публіцыстычнага выступлення, якое і будзе пачынацца адной з вышэйназваных уласнарытарычных фігур. Падрыхтуйце сваю прамову (3-5 хвілін) перад калегамі, студэнцкай аўдыторыяй.

**Заданне 4.** 1) Знайдзіце ў творах мастацкай літаратуры, перыёдыцы прыклад тэксту, які заканчваўся б рытарычным пытаннем, звароткам ці воклічам. Тэкст запішыце.

2) Падумайце, сачыненне на якую тэму вы зможаце закончыць рытарычным пытаннем. Напрыклад: *Хіба такое можна забыць? Што можа быць лепш за...?*

Выберыце або прапануйце самі тэму сачынення-мініяцюры; запішыце яго і ў канцы абавязкова сфармулюйце рытарычнае пытанне.

**Заданне 5.** Паразважайце, ці могуць змяшчаць рытарычныя пытанні і воклічы ў сваёй структуры звароткі? Прывядзіце прыклады.

**Заданне 6.** Прачытайце прыклады ўласнарытарычных фігур выразна, услых. Размяжуйце іх (рытарычнае пытанне, зваротак, вокліч). У чым заключаецца асаблівасць структуры рытарычнага пытання? Што агульнага вы заўважылі ў ніжэйпрыведзеных прыкладах? У чым адметнасць рытарычных воклічаў?

*1) Родны Мінск я пакінуў.*
*Пажарам і бомбамі гнаны.*
*Хто сказаў, што мой горад загінуў,*
*Што ён зруйнаваны? (А.Куляшоў)*

*2) О вецер! О ветрык мой ціхі! Ну, хіба ж ты зычыш мне ліха? (А.Бялевіч)*

*3) Чаго мы толькі не сустрэнем! Якіх не ўчуем галасоў у лесным звонкім сутарэнні між пышных хвой і верасоў! (Я.Колас)*

*4) Ці-ткі праўда, што душа мая загачана, нібы заваліўшаяся старая студня?.. Ці-ткі праўда, што новая крынічка не знойдзецца ўжо для мяне?.. (З.Бядуля)*

*5) Мой родны кут, як ты мне мілы!..*
*Забыць цябе не маю сілы! (Я.Колас)*

*6) Чалавек — вечны аптыміст! (В.Вітка)*

*7) Пакінь пытаць! Не дам я веры,*
*Каб Беларусь хто мог забыць:*
*Я пэўны — кожны з нас без меры*
*Любіў і будзе век любіць!!! (А.Паўловіч)*

***Заданне 7.*** Выразнасць побач размешчаных рытарычных воклічаў і пытанняў можа быць узмоцнена анафарай і эпіфарай. Паспрабуйце праілюстраваць гэта на прыкладах з мастацкай літаратуры.

***Заданне 8.*** Праверце сваю назіральнасць: успомніце, што цікавае вы заўважылі на зямлі, пад нагамі. Злучыце часткі тэксту рытарычнымі пытаннямі, выкарыстоўваючы сказы поўныя і няпоўныя.

*Мы штодзень ходзім па зямлі, але ці часта задумваемся, каб нахіліцца да долу і старанна, руплівa разгледзець усё, што знаходзіцца ў нас пад нагамі. А каб яшчэ мы прыляглі на зямлі і пачалі пільна разглядаць яе, то, бадай, на кожнай пядзі знайшлі б мноства цікавых рэчаў.*

*Хіба не цікавы...? Або...? Або...?*

*Хіба не цудоўная...? А...? А...?*

*Ды ці мала што яшчэ можна пабачыць на нашай зямельцы! Аб усім гэтым можна складаць казкі і апавяданні, вершы і паэмы.*

***Заданне 9.*** Паспрабуйце перакансруяваць апавядальныя сказы ў магчымыя сінтаксічныя ўласнарытарычныя фігуры.

*1) Не кожны ўмее расказваць пра сябе (І.Шамякін).*

*2) Я проста не мог не напісаць пра палескую прыроду (І.Мележ).*

*3) Кожны з нас памятае прачытаную ў юнацтве першую кнігу (Я.Скрыган).*

*4) Лёгкіх спраў ніхто з нас не шукае (М.Калачынскі).*

*5) Кожныя вароты па-свойму хваляць гаспадара (С.Баранавых).*

## IV. ФІГУРЫ РАЗМЯШЧЭННЯ І ПЕРАСТАНОЎКІ

Гэтыя рытарычныя фігуры заснаваны на парушэнні звычайнага парадку размяшчэння элементаў і (або) дыстантнага размяшчэння элементаў, якія звычайна стаяць побач. Яны пераважна дэманструюць стан нестабільнасці, змену настрою па прычыне атрыманай інфармацыі.

Да сінтаксічных фігур размяшчэння і перастаноўкі адносяцца:

1) інверсія; 2) сегментацыя; 3) парцэляцыя; 4) парантэза.

**1) Інверсія** (ад лац. *inversio* — перастаноўка) — такая расстаноўка слоў або словазлучэнняў (сінтаксічных кампанентаў) у сказе, якая парушае іх звычайны граматычны парадак. Інверсія дапамагае сэнсава ці эмацыянальна падкрэсліць пэўнае слова, думку, надае сказу своеасаблівую інтанацыю: *Ціха і маркотна было з рання. Сумётамі белымі, белымі, сіняватымі, касымі і з высокімі, аж да стрэх, грэбнямі замяла, засыпала завіруха маўкліва-акалелыя хаты за доўгую, завірушную ноч (М.Гарэцкі).*

Або:

*Заміж сноў сакаўных, зялёных,*
*мроі жоўтыя сніць зямля... (Н.Арсеннева)*

Парушэнне звычайнага размяшчэння слоў прыводзіць да таго, што «перастаўленае» слова аказваецца выдзеленым і такім чынам прыцягвае да сябе ўвагу, набывае пэўную лагічную, эмацыянальную, вобразную ацэнку: *«ён чалавек прыгожы», «рэдкай прыгажосці дзяўчына», «услых чытаць»* і інш.

Калі маўленню ўласціва напружанне, павышаная экспрэсіўнасць, то менавіта гэтая экспрэсіўная напружанасць маўлення, яе выразнасць і становяцца вынікам перастаноўкі частак выказвання.

Характэрнай асаблівасцю беларускай мовы з'яўляецца параўнальна свабодны парадак слоў у сказе. За членамі сказа не замацавана пэўнае месца: выказнік можа стаяць то пасля дзейніка, то перад ім, некаторыя тыпы акалічнасцей і дапаўнення таксама могуць займаць розныя пазіцыі ў структуры сказа. Але нягледзячы на значную свабоду парадку слоў у сказе, кожны член сказа мае звычайнае, уласцівае яму месца, якое вызначаецца структурай або тыпам сказа, сродкам сінтаксічнага выражэння гэтага члена сказа, месцам яго сярод іншых слоў, што непасрэдна звязаны з ім, а таксама прыналежнасцю да пэўнага стылю. Менавіта на гэтай падставе і адрозніваюць звычайны парадак слоў і інверсію, якая ў сваю чаргу часцей сустракаецца ў размоўным і мастацкім стылях.

У сказах з інверсіяй дзейнік размяшчаецца пасля выказніка (як дзеяслоўнага, так і састаўнога іменнага): *На пустым і закінутым полі* ***не народзяць*** *зярнят* ***каласы*** *(А.Бялевіч). Сонечным і белым, нібы залітым сырадоем,* ***здаваўся ты****, горад, у тое ранне (С.Грахоўскі).* Адваротны словапарадак з'яўляецца ўмовай адасаблення членаў сказа: *Сонца ўсё ж растапіла хмарку на ўсходзе і ўзнялося над зямлёй,* ***яркае і вясёлае*** *(Т.Хадкевіч).*

У вершаваных творах парадак слоў часта абумоўлены патрабаваннямі рытму і рыфмы, у гутарковай мове — заканамернасцямі пабудовы дыялога, сітуацыяй, калі на першае месца выносіцца інфармацыйна найбольш значны сінтаксічны кампанент: ***Цікавую*** *пісьменнік напісаў кнігу.*

Інверсія выконвае тры асноўныя функцыі: камунікатыўную, сінтаксічную і стылістычную.

Камунікатыўная функцыя словапарадку характарызуецца тым, што ён удзельнічае ў афармленні актуальнага члянення выказвання (яго ўключэння ў кантэкст ці сітуацыю). Так, у наступных сказах сродкамі парадку слоў выражаецца не толькі яго састаў, але і ступень камунікатыўнай значнасці кожнага слова: ***Хмары*** *плывуць над Дняпром.* ***Плывуць*** *над Дняпром хмары.* ***Над Дняпром*** *плывуць хмары.*

Сінтаксічная функцыя інверсіі заключаецца ў адрозненні членаў і тыпаў сказа, асабліва калі кантэкст не дазваляе размежаваць аманімічныя словаформы і словазлучэнні. Сказ з назоўніка і прыметніка пасля яго ў функцыі выказніка з'яўляецца двухсастаўным: *Дарога гладкая, слізкая, бліскучая (М.Лужанін).* Менавіта словапарадак дапамагае адрозніць дзейнік на першым месцы ад прамога дапаўнення за ім: *Зелле глушыць лён.* І наадварот: *Лён глушыць зелле.*

Стылістычныя функцыі (дадатковую семантычную і эмацыянальна-экспрэсіўную афарбоўку) набываюць словы сказа, размешчаныя ў незвычайным для іх парадку. Залежыць гэты парадак ад жанру твора, спосабу падачы матэрыялу. Так, пры апісанні выказнік звычайна стаіць на першым месцы: ***Стаяла*** *на дзіва прыгожая раніца, якія бываюць ў канцы жніўня, калі з поля ўжо звезена ўсё да апошняга снапа (М.Лынькоў).* Пры наяўнасці акалічнасных слоў у пачатку сказа дзейнік часцей за ўсё стаіць пасля выказніка: *У жніўні адкрываецца школьны базар.* Інверсія азначэння падкрэсліваецца асаблівай інтанацыяй: *Заліваюцца дзяўчаты галасамі* ***звонкімі, крышталёвымі*** *(Я.Колас), Адагнала думкі* ***звычайныя, жаночыя, чалавечыя*** *(Я.Колас).*

Выбіраючы той ці іншы парадак слоў, можна падкрэсліваць у залежнасці ад мэты выказвання тое ці іншае адценне значэння або

экспрэсіі. «Само сабой зразумела, — пісаў А.М.Пяшкоўскі, — што разабрацца ў гэтым багацці можна толькі з дапамогай якіх-небудзь асноўных кіруючых палажэнняў, якія здаўна зводзіліся да прызнання для кожнага сінтаксічнага тыпу так званага прамога і адваротнага парадку слоў... Калі ўлічыць, што прамы парадак успрымаецца як норма, а адваротны — як адступленне ад яе, то стылістычнае прымяненне яго такое: усякі адваротны парадак у тэксце павінен быць эстэтычна апраўданы»[15] . Такім чынам, непатрэбная інверсія ў сказе робіць мову напышлівай, манернай, таму ўжываць яе варта толькі тады, калі ў гэтым сапраўды ёсць неабходнасць.

**2. Сегментацыя** ўяўляе сабой экспрэсіўна-эмацыянальнае вылучэнне, адчляненне ад асноўнай часткі сказа нарматыўнай сінтаксічнай канструкцыі, якая застаецца цесна звязанай са сказам па сэнсу. Пры сегментацыі ў першую чаргу вылучаюць назоўны ўяўлення, або назоўны тэмы — такую эмацыянальна-экспрэсіўную канструкцыю, у якой у першую частку выносіцца тэма выказвання, а ў другую — звесткі пра яе, прычым сама тэма ў другой частцы дубліруецца часта займеннікам 3-й асобы (радзей лексічным або семантычным паўторам). Назоўны ўяўлення (назоўны тэмы) «называе ўспомнены і намаляваны ва ўяўленні таго, хто гаворыць, прадмет, з’яву, факт, пра якія ў наступным сказе выказваецца пэўная думка, выражаецца пачуццё»[16] . Названыя канструкцыі «пазбаўлены прэдыкатыўнасці, даюць толькі назву ўяўлення, як бы акрэсліваюць тэму наступнай гаворкі, але не выражаюць пачуцця»[17] . Напрыклад: ***Справядлівасць****! Дзе і калі яна была беднаму, цёмнаму чалавеку! Дзе яе шукаць яму, адзінокаму, безабароннаму, які, можна сказаць, і свету не бачыў далей куранёўскіх балот, які і ў Алешніках нясмела азіраецца (І.Мележ);* ***Спадчына****. Якое простае слова, і які няпросты яго сэнс! (В.Вітка);* ***Палессе...*** *Велізарны, поўны таямніц край у самым цэнтры Еўропы (Ю.Лабынцаў).*

**Заўвага.** Варта адрозніваць сегментаваныя канструкцыі (назоўны тэмы) ад рытарычных зваротКаў, напрыклад: *Сонца, сонца! З мірнаю зарою ты вярнiся ў стэп з начных дарог (А.Вялюгін)*, а таксама ад намінатыўных сказаў: *Нёман. Гаючая родная прыгажосць (Я.Брыль).*

---

[15] Пешковский А.М. Вопросы методики русского языка, лингвистики и стилистики. — М.; Л, 1930. — С. 157.

[16] Яўневіч М.С., Сцяцко П.У. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы. — 3-е выд.— Мн.: Вышэйшая школа, 1987. — С. 122.

[17] Беларуская граматыка: У 2 ч. Ч.2. Сінтаксіс. — Мн.: Навука і тэхніка, 1986. — С. 232.

**3.** У мастацкіх творах і газетнай публіцыстыцы даволі часта сустракаецца падзел сказа з пэўнай сэнсава-стылістычнай мэтай на некалькі асобна аформленых паведамленняў. Такія сінтаксічна-стылістычныя канструкцыі, якія далучаюцца да асноўнага выказвання як самастойныя сказы, называюць парцэляванымі, а сама фігура падобнага экспрэсіўнага адчлянення — **парцэляцыяй** (ад франц. *parceller* — падзяляць на дробныя часткі).

Сутнасць гэтай своеасаблівай экспрэсіўнай фігуры — у такім чляненні сказа, пры якім «змест выказвання рэалізуецца не ў адной, а ў дзвюх і больш інтанацыйна сэнсавых канструкцыях, размешчаных адна за другой з працяглымі паўзамі»[18] : *І яшчэ: на кожнай галінцы абавязкова пакідалі па адным-два арэхі.* ***Для вавёрак*** *(М.Шыманскі); А скрыпка спявае.* ***Сардэчна і сумна*** *(Я.Брыль).*

Парцэляцыю варта адрозніваць ад далучальных канструкцый, сутнасць якіх у далучэнні да асноўнага выказвання дадатковых звестак і тлумачэнняў, што ўзнікаюць у свядомасці гаворачага ўжо пасля таго, як выказана асноўная думка: *Я хацеў бы таксама вось так...* ***Тут. І адзін. І каб да апошняй хвіліны на нагах*** *(І.Шамякін).*

У якасці парцэляваных (выдзеленых са сказа) могуць ужывацца словы, спалучэнні слоў, а таксама сказы. Пры гэтым яны заўсёды размяшчаюцца пасля асноўнага выказвання і ўтвараюць адно сінтаксічнае цэлае, у якім другая частка граматычна і сэнсава звязана з першай. Напрыклад, выказванне *Пытанне, безумоўна, жыццёва важнае.* ***Але зусім не дыскусійнае*** *(І.Шамякін)* пунктуацыйна аформлена ў выглядзе асобных сказаў, але сінтаксічна — гэта адзін просты сказ з аднароднымі выказнікамі. Параўнаем: *Пытанне, безумоўна, жыццёва важнае, але зусім не дыскусійнае.*

У залежнасці ад канкрэтнай сітуацыі і лексічнага напаўнення сінтаксічнай канструкцыі ўвогуле, асабліва адчлененай часткі, парцэляцыя можа выкарыстоўвацца як сродак паэтызацыі маўлення і надання яму іранічнага адцення: *Гэтая рытарычная запаведзь ужо неаднойчы праверана практыкай.* ***І нашай, і замежнай*** *(з газет).*

Парцэлятыўныя часткі, вылучаныя са сказа, вызначаюцца інфарматыўнасцю, эмацыянальнай экспрэсіўнасцю, стылістычнай выразнасцю. Інтанацыйна яны выдзяляюцца працяглай паўзай.

**4.** Да вышэйназванай групы фігур адносіцца і **парантэза** — увядзенне ў структуру сказа пэўнай устаўкі (сінтаксічнай адзінкі), якая

[18] Сцяцко П.У., Гуліцкі М.Ф., Антанюк Л.А. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў. — Мн.: Вышэйшая школа, 1990. — С. 97.

граматычна не звязана з яго членамі, але, выконваючы сэнсавую, экспрэсіўную функцыю, уносіць у асноўны сказ дадатковыя паведамленні, удакладненні, тлумачэнні. Сказ пры гэтым разрываецца граматычна не звязаным з ім словам, словазлучэннем і нават іншым сказам. Эфект парантэзы ствараецца дзякуючы ўзаемаперасячэнню двух выказванняў: *На купінах каля пнёў, дзе каса не кранула травы* ***(яе цяжка абразаць ля дрэва)****, застылі, мусіць, мокрыя ад расы, блакітныя балотныя званочкі (І.Пташнікаў).*

Калі сказ суправаджаецца пытальнай або клічнай інтанацыяй, тады пасля іх ставіцца пытальнік або клічнік: *Міхал —* ***навошта ўжо таіцца?*** *— любіў-такі павесяліцца (Я.Колас). Яўмен чытаў газету, у якой зноў* ***(каторы раз за вясну!)*** *пісалі пра Сяргея Бярозку (І.Шамякін).*

### *М І Н І П Р А К Т Ы К У М*

***Заданне 1.*** Прыслухайцеся да вуснага маўлення вашых сяброў, калег, знаёмых, родных. Паназірайце, ці сустракаюцца ў ім сказы з парцэляцыяй. Запішыце 2-3 прыклады.

***Заданне 2.*** Паразважайце наконт жыццёвага творчага роздуму Канстанціна Меліхана. Наколькі апраўданы ў жыцці гэтыя словы? Як мяняе сэнс выказвання ўжытая сінтаксічная фігура? Назавіце яе.

*У маладосці*
*Я кахаю толькі цябе.*
*У старасці*
*Цябе кахаю толькі я. (К.Меліхан)*

***Заданне 3.*** Знайдзіце прыклады сказаў з парцэляцыяй у матэрыялах апошняга нумара той газеты, якую вы чытаеце рэгулярна. Занатуйце некалькі прыкладаў.

***Заданне 4.*** Пашукайце ў творах мастацкай літаратуры, класічнай і сучаснай, прыклады інверсіі і запішыце іх.

***Заданне 5.*** Прачытайце выразна ўслых верш Ніла Гілевіча. Укажыце ў ім інверсію. Прачытайце верш з правільным лагічным націскам. Якія яшчэ экспрэсіўныя сінтаксічныя фігуры вы заўважылі ў гэтым вершы?

*Страціў слова, страціў спадчыннае слова —*
*Штосьці страціў у душы абавязкова!*
*Можа — годнасці хоць кропельку малую?*
*Можа — мудрасці хоць дробачку якую?*
*Можа — памяці хоць зернетка-іскрынку?*
*Я не ведаю дакладна, што ты страціў.*
*Запытайся — ці не скажа табе маці...*

**Заданне 6.** Ад перастаноўкі слоў часта змяняецца сэнс выказвання. Паразважайце, на якое слова трэба акцэнтаваць увагу, выдзеліць яго лагічным націскам у наступных варыянтах сказа. Абгрунтуйце свае меркаванні.

*1) Нават навукоўцы не маглі прадбачыць такіх наступстваў.*
*2) Навукоўцы нават не маглі прадбачыць такіх наступстваў.*
*3) Навукоўцы не маглі нават прадбачыць такіх наступстваў.*
*4) Навукоўцы не маглі прадбачыць нават такіх наступстваў.*
*5) Прадбачыць такіх наступстваў не маглі нават навукоўцы.*
*6) Такіх наступстваў не маглі прадбачыць нават навукоўцы.*

**Заданне 7.** Вы, бадай, заўважылі, што адна з канструкцый сегментацыі — «назоўны ўяўлення» — выкарыстоўваецца звычайна ў пачатку тэксту, мікратэксту, абзаца, раздзела. Напішыце невялічкае сачыненне на вольную тэму, ужыўшы згаданую канструкцыю.

Паназірайце, якія сродкі выразнасці маўлення выкарысталі ў аналагічных сачыненнях вашы калегі.

**Заданне 8.** Паназірайце, як змяняецца сэнс сказаў у залежнасці ад парадку слоў і якое слова трэба выдзеліць лагічным націскам у кожным выпадку.

Складзіце просты сказ з 5 слоў і пакажыце, колькі адценняў значэння вы зможаце перадаць у ім з дапамогай парадку слоў.

*1) Я хачу расказаць сягоння пра гэтую навіну. — Я хачу расказаць пра гэтую навіну сёння. — Сёння пра гэтую навіну хачу расказаць я.*

*2) Мне вельмі патрэбна ваша дапамога! — Ваша дапамога вельмі патрэбна мне! — Вельмі мне патрэбна ваша дапамога!*

**Заданне 9.** Прачытайце выразна ўслых урыўкі з мастацкіх твораў, вытрымкі публіцыстыкі. Знайдзіце ў прапанаваных прыкладах усе выпадкі ўжывання экспрэсіўных сінтаксічных фігур размяшчэн-

ня і перастаноўкі, а таксама і іншых, раней вывучаных фігур. Падумайце, якія сэнсавыя адценні надаюць фігуры выказванням і дакажыце неабходнасць экспрэсіі ў сказах.

*1) Амаль усе дзеці — паэты. Ды, мусіць, і ўсе. У сваёй наіўнай любві да жыцця, у сваёй вясёлай словатворчасці (Я.Брыль).*

*2) Слязіна ўдзякі,*
*Позірк мглі,*
*Радзіце, каласы і травы.*
*Быць чалавекам на зямлі*
*Зямля бацькоў*
*Дала мне права.*
*. . .*
*Яе, суровую, адну*
*Люблю я не па абавязку.*
*Прымаю, як і ў даўніну,*
*І гнеў нябёс,*
*І казкі ласку. (Р.Барадулін)*

*3) Верасоўка. Верасовачка... Сапраўды мілагучная назва той мясціны, дзе паэт нарадзіўся, дзе пачуў матчыну песню, матчыну мову, дзе ўпершыню пераступіў парог матчынай хаты. Адсюль, з ушацкага прыстанку, была ўзята пуцёўка на вучобу ў Мінск, на далёкія цалінныя землі, на працу, на жыццё (А.Астраух).*

*4) Дзед то палітыкаў папляжыць*
*(«І што ім трэба, ты скажы?»),*
*а больш гамонка ўсё ж пра наша,*
*што набалела на душы.*
*Яўхім дыміць, каўтае словы —*
*відаць, у роздуме штодня. (А.Зэкаў)*

*5) Прынёс бацька паўбутэлечку, і хоць не хацелася грашыцца старым (абедня яшчэ не адышла), але дзеля дарагога, любага сына і яны селі снедаць (М.Гарэцкі).*

*6) Пра паэзію Барадуліна і яго самога можна гаварыць бясконца, ды ўсё роўна сказанае не вычарпае ягонай сутнасці. Барадулін як чалавек і паэт невычэрпны. Бо ён арганічна таленавіты. І яшчэ ён зменлівы. Зменлівы, як кожная жывая істота, як талент, які бярэ ад жыцця на шматпакутнай святой зямлі пад сонцам любае Бацькаўшчыны (В.Быкаў).*

*7) Шэпчуць згодна каласінкі.*
*Гойдаюцца нівы,*
*Ходзіць гоман ля збажынкі,*
*Мілы і шчаслівы. (Я.Колас)*

*8) Мінае лета, пачынае журботна курлыкаць жураўліная восень, пасля — мяцеліцы, снягі, а Леанід Акімавіч ходзіць і ходзіць той дарогай, па якой вялі на смерць Ніну... Яго Ніну... (Б.Сачанка).*

*9) Колькі хаваў блізкіх, сяброў — такога не было. Але ў яго з'явіўся іншы клопат. Пра жывых. Пра дзяцей (І.Шамякін).*

*10) Колас.*
*Купала...*
*У гуках імён іх люлянку я чую,*
*Якую матуля калісь*
*над калыскай маёю спявала —*
*Колас.*
*Купала... (У.Някляеў)*

*11) Пакутавалі людзі, сумавала зямля і ўсё, што расло і жыло на ёй. Неўзаметку падымаліся к небу іх слёзы, падымаліся не год і не два, а цэлыя вякі, а там недзе сплываліся ў адно месца (Я.Колас).*

*12) Дарогі, дарогі, дарогі...Колькі вас, брукаваных і шасейных, гравейных і селавых, насыпных і мокрых, прайшлі людзі за гэты час разам з табуном (Я.Сіпакоў).*

## V. МАЎЛЕНЧА-ДЫЯЛАГІЧНЫЯ ФІГУРЫ

Сінтаксічныя фігуры названай групы вельмі часта выкарыстоўваюцца ў маналагічным маўленні, прычым як у вусным (публічная прамова), так і пісьмовым (публіцыстыка). Дыялог у чыстым выглядзе рэдка выкарыстоўваецца ў межах вялікай аўдыторыі, таму аратар сістэматычна задае пытанні ад сябе ці іншай асобы і тут жа адказвае на іх ад сябе асабіста або іншых асоб. Уключэнне элементаў дыялогу (рэальнага, а часцей гіпатэтычнага) ў маналагічнае маўленне надае яму пераканаўчасць і выразнасць. Галоўная рыса вуснага маўлення — свабода ад «строгага» сінтаксісу: у вуснай фразе члены сказа (дзейнікі, выказнікі, акалічнасці і інш.) могуць займаць самыя розныя пазіцыі. Вуснай фразе ўласціва экспрэсіўная роля інтанацыі, пэўная вольнасць у выкарыстанні слоў-паразітаў (*значыць, так сказаць* і інш.), так званых тэмпераментных

эпітэтаў (*шалёная ідэя, жахлівае расчараванне* і інш.). Адначасова гэтая экспрэсіўная сінтаксічная форма арганізацыі маўлення дапамагае папярэдзіць магчымыя пярэчанні апанента, паказаць неперaканаўчасць яго довадаў. Псеўдадыялог можа выступаць у наступных формах.*

**1. Дыялог паміж аратарам і аўдыторыяй**

*1) — Вы спытаеце: што нам перашкаджае гандляваць з Расіяй, супрацоўнічаць з іншымі дзяржавамі, устанаўліваць і развіваць эканамічныя сувязі? Адкажу: нічога не перашкаджае. Калі ласка! Давайце дамовімся — і пра рэсурсы, і пра цэны, і пра ўсё астатняе.*

*2) — У вас адразу ўзнікае пытанне: а як быць са старымі кадрамі? Адказваю: пытанне даволі складанае, але будзем яго вырашаць.*

**2. Дыялог паміж аратарам і апанентам**

*1) — Хіба вы не памятаеце, што партыя — гэта перш-наперш сам народ, і ў яго радах большасць абяздоленых! Дазвольце тады запытацца: у чым яны павінны каяцца?*

*2) — Пакінуць палітычную арэну?! Не больш і не менш. Не, шаноўныя панове. Пакінуць прыйдзецца вам і вось па якой прычыне...*

**3. Дыялог паміж аратарам і трэцяй асобай**

У якасці трэцяй асобы можа выступаць гістарычны дзеяч, Бог, унутраны голас і інш.

*1) — Хачу задаць пытанне «А што далей будзе, як жыць?» Мне толькі што паведамілі афіцыйна: «Міністры шукаюць выйсце з гэтай сітуацыі». Сумняваюся я ў эфектыўнасці іх дзеянняў.*

*2) — Яго праграма ўключае, бадай, самыя сляпыя інстынкты. Яны могуць прывесці нас толькі да канфліктаў, да гразі, да крывавых расправаў. Ну і што! Напляваць! Затое душу адвядзём! Ці так гэта?!*

---

* Класіфікацыя маўленча-дыялагічных фігур і мініпрактыкум ілюструюцца прыкладамі, узятымі з сучасных аратарскіх выступленняў, а таксама з газетнай і часопіснай перыёдыкі. Разам з тым выкарыстаныя прыклады рэканструяваны (скарочаны або, наадварот, пашыраны) з той мэтай, каб лягчэй успрымаць іх менавіта для ілюстрацыі. Гэта дазваляе не рабіць спасылкі на тыя тэксты, адкуль прыклады былі ўзяты.

*3) — Цікава, што нам сказаў бы цяпер цар Пётр, гледзячы на ўсе гэтыя справы.*

### 4. Дыялог паміж аўдыторыяй і трэцяй асобай

*1) — Запытайцеся ў любога рабочага чалавека, якія тавары ён хацеў бы набыць для сваёй сям'і — айчыннай ці імпартнай вытворчасці. Ці варта спрачацца, што адкажа на гэта большасць насельніцтва?*

*2) — І што я бачу? У адказ на яго жудасныя страшэнныя словы праклёну зала маўчыць. Чаму яна маўчыць?*

### 5. Дыялог аратара з самім сабой

*1) — Але няўжо жыццё не пераконвае нас у адваротным? — Вядома, пераконвае. — Вялізныя чэргі каля вінна-гарэлачных аддзелаў, павелічэнне колькасці малалетніх (і не толькі малалетніх) алкаголікаў, прастытутак, наркаманаў і, як вынік, рост злачыннасці. Гэта паказчыкі нашага маральнага здароўя? – Пагадзіцеся, безумоўна, не!*

*2) — Дык што — мы не выспелі для разумнага чалавечага жыцця ва ўмовах дэмакратыі? — Выходзіць, аднак, не выспелі.*

*3) — Вось якую задачу нам прыйдзецца вырашаць. — Рэальна гэта? — Цалкам рэальна. — Складана? — Так.*

### 6. Дыялог апанента з самім сабой

*— Шаноўнаму спадару ўсе названыя праблемы ўяўляюцца вельмі лёгкімі і вырашальнымі. Ён разважае наступным чынам: Цяжкае жыццё на вёсцы, у калгасах? — Неабходны фінансавыя паступленні ў гэтую сферу; Няма добрых і якасных тавараў? — Вінаваты кааператары; Ці патрэбны нам эканамічны рынак? — Не патрэбны...*

## *М І Н І П Р А К Т Ы К У М*

***Заданне.*** Вызначце віды сінтаксічных фігур у псеўдадыялогах. Адказы аргументуйце.

*1) — За кожнае слова і ўчынак мы гатовы несці адказнасць. На кожнае ганебнае, гнеўнае слова, слова праклёну мы папе-*

*раджальна гаворым: пачакайце, не спяшайцеся. Прапануйце што-небудзь больш канструктыўнае. Калі можаце.*

*2) — Вы спытаеце ў мяне, ці ёсць разумнае выйсце з гэтай сітуацыі? — Я адкажу: ёсць, безумоўна.*

*3) — Дык што нам рабіць? Калі мець на ўвазе нас, творчую інтэлігенцыю краіны, то нашыя магчымасці ў эканоміцы роўныя нулю, маральнасць таксама нам не падуладная. Выхаваць будучыя пакаленні, як нам хацелася б, мы не ў стане, таму што даўно збанкруціліся ў якасці выхавацеляў. Відавочна, трэба пачынаць з малога: паспрабаваць разбудзіць у сабе сумленне як першасны элемент маральнасці.*

*4) — Дык што ж урэшце рэшт рабіць, — запытаеце вы. — Ці ёсць яшчэ які-небудзь шлях? — Адказаць цяжка.*

*5) — Трыццаць гадоў таму назад мяне, выпускніка школы, спрабавалі запэўніць, што сучаснае пакаленне будзе жыць пры камунізме. Сёння ўжо тлумачаць, што мы, нарэшце, дачакаемся светлага будучага. Прабачце, не верыў і тады, не паверу і цяпер.*

*6) — У мяне часта пытаюцца, нядаўняе здарэнне было промахам ці трагічнай памылкай. Не, гэта было наўмысным злачынствам.*

*7) — Панове дэпутаты! Панове начальнікі! Пакуль вы надрываеце свае глоткі на мітынгах, з'ездах і сесіях, вашы маці, вашы жонкі , дзеці вашы глядзяць на вас з дакорам стомленымі вачамі і просяць моўчкі: жыцця лепшага б...*

*8) — Усе вышэйназваныя пытанні, у тым ліку і праблема нацыянальна-тэрытарыяльнага падзелу краіны, вас проста знішчаюць, бо адказаць вам ужо няма чаго.*

*9) — Факты гэтыя выклікаюць трывогу. Але, не ведаючы іх, цяжка адказаць на пытанне: «Чыя гэта моладзь?»*

*10) — Вашы прапановы, магчыма, і слушныя, але нешта ў душы падказвае мне, што сённяшняе «дабро» непазбежна стане заўтрашнім злом.*

## СА СТАРАЖЫТНАЙ СПАДЧЫНЫ

(Вершы пра сінтаксічныя фігуры
з лацінскай паэзіі IV – VI ст.ст)

Вершы захаваліся ў рукапісах VIII ст. без імя аўтара. Напачатку, пры першых выданнях, вершы адносілі да I ст. да н.э., бо яны змяшчалі вельмі яркія моўныя архаізмы. Разам з тым метрычныя асаблівасці яўна сведчылі аб тым, што вершы напісаны не раней IV ст., а іх адрасат Месій можа атаясамлівацца з граматыкам Месіем Арузіанам, аўтарам слоўніка граматычных канструкцый, прысвечанага консулам 396 г. Вершы ўяўляюць сабой пералік рытарычных фігур з загалоўкамі, азначэннямі (тлумачэннямі) і прыкладамі; у загалоўках трохрадкоўяў падаюцца іх грэчаскія назвы, у тэксце — лацінскія. Усе тлумачэнні і прыклады аўтара дастаткова дакладныя і каментарыя не патрабуюць, але алфавітны парадак падчас перашкаджае сучаснаму чытачу зразумець логіку антычнага вучэння аб фігурах. Таму падаецца мэтазгодным, зыходзячы з прадстаўленага матэрыялу ў дапаможніку, вылучыць з вялікай колькасці вершаў толькі тыя, што змяшчаюць рытарычныя сінтаксічныя фігуры.

### ВЕРШЫ ПРА ФІГУРЫ КРАСАМОЎСТВА*

Мессий, я рассудил описать для тебя все фигуры
Речи, каждой из них посвятив три равные строчки
И приведя для каждой пример из стихов или прозы.

«ЭПИЗЕВКСИС»

Вот *удвоение* — дважды подряд повторяется слово:
«Фивы, Фивы, соседственный град, столь славный издревле!»
«Сын мой, сын мой, опора моя в преклонные годы!»

«ПАРЕНТЕЗА»

*Вставка* бывает, когда внутрь фразы вставляется фраза:
«Как только мы пришли, – а было весеннее время,
Праздник Цереры и Флоры, — пошли мы богам помолиться».

«ЗЕВГМА»

В *связке* несколько слов единым связаны словом:
«Эбал мечом, Ликон бьёт копьём, а Педасим стрелою» —
Здесь относится «бьёт» и к первым словам, и к последним.

---

* Вершы ўзяты з кнігі: Поздняя латинская поэзия. — М.:Худож.лит., 1982. — С.432-442.

«ЭЛЛИПС»

*Пропуск* мы делаем там, где легко восполняется слово.
«Вот он в беде – но никто не поможет, никто не подскажет,
Все лишь винят», — а «его» и «ему» мы легко пропускаем.

«ПЕРИОД»

Слово *«период»* значит *«охват»*: в нём два или больше
Связано членов подряд, но крайняя мера — четыре;
Сверх четырёх — это будет уже неохватною речью.

«АНАФОРА»

Вот *единоначатье,* когда повторяется слово:
«Сам ликовал на пиру, сам счастья желал новобрачной,
Сам прославлял и отца и детей, и сам погубил их».

«ЭПИФОРА»

Вот, напротив, повтор на конце — *единоконечье*:
«Силы даны мне судьбой; удача дана мне судьбою,
И неудача — судьбой; всё в мире вершится судьбою».

«КОЙНОТЕС»

Будет *кольцо*, если мы совместим эти оба приёма:
«Хочешь уменья достичь — учись; хочешь умственной силой
Располагать — учись; хочешь брезговать миром — учися».

«АНАДИПЛОСИС»

Там *удвоение,* где два раза одно говорится:
«Нет, я пойду на него, хоть и мощен перун его длани,
Мощен перун его длани, а сила — в жестоком железе».

«ПОЛИСИНДЕТОН»

*Многосоюзие* — там, где меж членами вставлены связки:
«Тот его вводит в обман, а он и рад, а меня уж
Даже тревога берёт, что обида грозит чужеземцу».

«ДИАЛЕЛИМЕНОН»

При *бессоюзии,* наоборот, изымаются связки:
«Сам познай себя, сам исцели себя, сам себе умным
Будь советником, злых избегай, как змеи ядовитой».

«АНАСТРОФА»

*Перестановка* в словах бывает и в прозе, и в метрах:
«Самой по малой вине», «в необдуманном каясь решенье»,
«Листьям подобно древесным, по мудрого слову Гомера..»

«АНТИМЕТАБОЛА»

*Перестановка* меняет местами слова и понятья:
«Тех не пытай, с кем ты дружен, но с теми дружи, кто испытан».
«Силы есть — времени нет; есть время — да сил не хватает».

«ЭПИПЛОКА»

Будет *сплетенье,* когда конец сплетётся с началом:
«Так я, подумав, сказал; сказав, убедил; убедивши,
Сам с посольством пошёл; пошёл и добился успеха».

«АНТИТЕЗА»

Сделав *контраст* — превратим несхожесть в противоположность;
«Ты — учитель, я — ученик; ты — писец, я — начальник;
Ты — актёр, я — зритель: свищу – и ты сходишь со сцены».

«ЭПЕКФОНЕСИС»

Нам *восклицанье* дает немедленный выдох на чувства:
«Вот, я разбит и как не сказать: Фортуна, Фортуна,
Как жестока привычка твоя возносить, унижая!».

## МІНІПРАКТЫКУМ

***Заданне.*** Прачытайце выразна ўслых вершы пра экспрэсіўныя сінтаксічныя фігуры з лацінскай паэзіі IV–VI ст.ст. Звярніце ўвагу на выдзеленыя курсівам словы ў першым радку кожнага верша. Гэтыя словы вызначальныя, бо ў іх — сутнасць, семантыка названай фігуры. Паспрабуйце суаднесці некаторыя загалоўкі вершаў з сучаснай тэрміналогіяй назваў экспрэсіўных сінтаксічных фігур. Падкрэсліце іх і размяркуйце адпаведна знаёмай вам класіфікацыі.

# СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Абабурка М. Культура беларускай мовы. — Мн.: Вышэйшая школа, 1994. — 122 с.

2. Акимова Г.Н. Экспрессивные свойства синтаксических структур // Предложение и текст: семантика, прагматика и синтаксис. — Л.: ЛГУ, 1988. — С. 18–23.

3. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч.2. Сінтаксіс / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я.Коласа. — Мн.: Навука і тэхніка, 1986. — 327с.

4. Беларуская мова. Энцыклапедыя / Беларус. Энцыкл.; Пад рэд. А.Я.Міхневіча; Рэдкал.: Б.І.Сачанка (гал.рэд.) і інш. — Мн.: БелЭн, 1994. — 655 с.

5. Береговская Э.М., Верже Ж.-М. Занятная риторика. — М.: Языки русской культуры, 2000. — 152 с.

6. Каўрус А.А. Стылістыка беларускай мовы. — Мн., 1980. — 260 с.

7. Киселёва Л.А. Теоретические проблемы исследования языка как средства воздействия. Автореф. дис. ... докт. филол. наук. — М., 1973. — 48 с.

8. Кухаренко В.А. и др. Отступление в структуре текста // Коммуникативная направленность текста и его перевод. — Киев: КГУ, 1988. — С.67–71.

9. Лазарук М.А., Ленсу А.Я. Слоўнік літаратуразнаўчых тэр-мінаў. — Мн.: Народная асвета, 1996. — 176 с.

10. Лингвистический энциклопедический словарь / Гл.ред. В.Н.Ярцева. — М.: Сов. энциклопедия, 1990. — 685 с.

11. Луцкий К.Л. Судебное красноречие. — М.: Наука, 1992.

12. Маслова В.А. Лингвистический анализ экспрессивности художественного текста: Учебн. пособие. — Мн.: Выш. школа, 1997. — 156 с.

13. Панасюк А.Т. К вопросу об экспрессивном значении синтаксических конструкций // Современный русский язык и методика его преподавания. — Душанбе, 1972. Ч.2. — С. 20–29.

14. Педагогическое речеведение. Словарь-справочник. — Изд. 2-е, испр. и доп. / Под ред. Т.А.Ладыженской и А.К.Михальской; Сост. А.В.Князьков. — М.: Флинта, Наука, 1998. — 312 с.

15. Поздняя латинская поэзия / Пер. с лат.; Состав. и вступ. статья М.Гаспарова. — М.: Худож.лит., 1982. — 719 с.

16. Попов А.С. Именительный темы и другие сегментированные конструкции в современном русском языке // Развитие грамматики и лексики современного русского языка. — М.: Наука, 1964. — С. 256–274.

17. Проблемы экспрессивной стилистики / Отв. редактор Т.Г.Хазагеров. — Ростов, 1987. — 144 с.

18. Рагойша В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах: Дапам. — Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 2001. — 384 с.

19. Розенталь Д.Э., Джанджакова Е.В., Кабанова Н.П. Справочник по правописанию, произношению, литературному редактированию. — Изд-е второе, исправленное. — М.: ЧеРо, 1998. — 400 с.

20. Русский язык. Энциклопедия. Гл. ред. Ф.П.Филин. — М.: Советская энциклопедия, 1979. — 432 с.

21. Салдаценка Н.Д. Прагматычныя аспекты сінтаксічнай экспрэсіі // Беларуская мова ў другой палове XX стагоддзя: Мат-лы Міжнароднай навук. канферэнцыі, 22–24 кастр. 1997 г. — С. 208–210.

22. Сковородников А.П. Экспрессивные синтаксические конструкции современного русского литературного языка. — Томск, 1981. — 255 с.

23. Служевская Т.Л. Уроки русской словесности. Практикум по культуре речи. — СПб: Издат-во «Тускарора» совместно с фирмой «РиД», 1997. — 256 с.

24. Сцяцко П.У., Гуліцкі М.Ф., Антанюк Л.А. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў. — Мн.: Вышэйшая школа, 1990. — 222 с.

25. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы. — Мн.: БелЭн, 1996. — 784 с.

26. Хазагеров Г.Г., Корнилова Е.Е. Риторика для делового человека: Учебное пособие. — М.: Флинта, Московский психолого-социальный институт, 2001. — 136 с.

27. Хазагеров Т.Г., Ширина Л.С. Общая риторика: Курс лекций; Словарь риторических приёмов / Отв. ред. Е.Н.Ширяев. — 2-е изд., перераб. и доп. — Ростов-на-Дону: Феникс, 1999. — 320 с.

28. Цікоцкі М.Я. Стылістыка беларускай мовы: Вучэб. дапам. для фак. журналістыкі. — 2-е выд., перапрац. і дап. — Мн.: Універсі-тэцкае, 1995. — 294 с.

29. Чайковский Р.Р. Общая лингвостилистическая категория экспрессивности и экспрессивность синтаксиса // Учён. зап. МГПИИЯ им. М.Тореза. Вопросы романо-германской филологии. — М., 1971. Т.64. — С. 188–197.

30. Человеческий фактор в языке. Языковые механизмы экспрессивности. — М., 1991. — 218 с.

31. Экспрессивность текста и перевод. — Казань: КГУ, 1991. — 287 с.

32. Юрэвіч А.К. Стылістыка беларускай мовы: Вучэб. дапам. — 2-е выд., перапрац. і дап.. — Мн.: Вышэйшая школа, 1992. — 288 с.

33. Яўневіч М.С., Сцяцко П.У. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы. — 3-е выд. — Мн.: Вышэйшая школа, 1987. — 272 с.

# ЗМЕСТ


Ад аўтара.....................................................................................3

Экспрэсіўнасць і сінтаксічная арганізацыя маўлення......................5

Сінтаксічныя фігуры і іх класіфікацыя...........................................9

I. Фігуры павелічэння аб'ёму выказвання..................................12

*Мініпрактыкум*...................................................................24

II. Фігуры памяншэння аб'ёму выказвання...............................34

*Мініпрактыкум*...................................................................37

III. Уласнарытарычныя фігуры...............................................39

*Мініпрактыкум*...................................................................42

IV. Фігуры размяшчэння і перастаноўкі..................................45

*Мініпрактыкум*...................................................................49

V. Маўленча-дыялагічныя фігуры..........................................52

*Мініпрактыкум*...................................................................54

Са старажытнай спадчыны
(вершы пра сінтаксічныя фігуры з лацінскай паэзіі IV–VI ст.ст.)....56

Спіс рэкамендаванай літаратуры..................................................59

## Для нататкаў

**Для нататкаў**

Вучэбнае выданне

**Шандроха** Нона Эдмундаўна

**ЭКСПРЭСІЎНЫ СІНТАКСІС**

Вучэбна-метадычны дапаможнік

Рэдактар Н.М.Красніцкая
Камп'ютарная вёрстка: Т.А.Каваленка

Здадзена ў набор 02.09.2002. Падпісана да друку 27.11.2002.
Фармат 60х84/16. Папера афсетная №1.
Друк афсетны. Гарнітура Таймс.
Ум.друк.арк.3,65. Ул.-выд.арк.3,46. Тыраж 50 экз. Заказ .

Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны
універсітэт імя Янкі Купалы».
ЛВ №96 ад 02.12.97. Вул. Пушкіна, 39, 230012, Гродна.

Надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела
Установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны
універсітэт імя Янкі Купалы».
ЛП №111 ад 29.12.97. Вул. Пушкіна, 39, 230012, Гродна.